Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш

# Літаратурнае чытанне

# 2

Частка 1



## Абмяркоўваем творы з прачытанага раздзела

Перагарніце старонкі і прыгадайце, якія творы чыталі ў раздзеле. На якую тэму гэтыя творы? Які з гэтых твораў вас найбольш уразіў, запомніўся? Раскажыце аб ім па плане:

1. Назва і аўтар твора.
2. Дзейныя асобы (персанажы).
3. Важная падзея ці малюнак прыроды.
4. Пачуцці аўтара і адчуванне чытача.
5. Чым запомніўся твор?
6. Які вывад робім для сябе?





## Як лягчэй вывучыць верш на памяць?

**Васілінка вучыць так:**

1. Чытаю верш услых уважліва і ўдумліва.
2. Пачынаю вучыць верш па частках (па два ці чатыры радкі).
3. Чытаю і расказваю адну частку, другую. Потым абедзве часткі разам. Так раблю да канца верша.
4. Паўтараю ўсе часткі разам. Чытаю і расказваю ўвесь верш выразна.



## Як лягчэй вывучыць верш на памяць?



**А Лянок вучыць так:**

1. Чытаю верш і ўяўляю малюнкі.
2. Дзялю верш на часткі па ўяўленых малюнках.
3. Чытаю частку верша, потым паўтараю яе.
4. Чытаю і паўтараю наступную частку.
5. Паўтараю абедзве часткі на памяць разам.
6. Чытаю і паўтараю наступную частку. Далучаю яе да вывучаных і расказваю.
7. Паўтараю ўсе часткі разам. Чытаю і расказваю ўвесь верш выразна.



Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш

# Літаратурнае чытанне

Вучэбны дапаможнік для **2** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

2-е выданне

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2021

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 821.161.3.09(075.2=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я71
А72

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук *Н. М. Антановіч*;

метадычнае аб’яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Пачатковая школа № 103 г. Мінска» (настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі *А. У. Івановіч*)

## Умоўныя абазначэнні:

 — гутарым па тэме твора;

 — вызначаем значэнне слоў;

 — выконваем творчае заданне;

 — азбука ветлівасці;

 — чароўная скарбонка.

ISBN 978-985-594-784-5 (ч. 1)
ISBN 978-985-594-783-8

© Антонава Н. У., Буторына І. А., Галяш Г. А., 2016
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2016

Правообладатель Национальный институт образования



**Восень, восень залатая,**
**Сее радасць па зямлі.**
*Сяргей Новік-Пяюн.*

# КОЛЕРЫ ГОДА. ВОСЕНЬ

## Верасень

Вырас верас і цвіце.
Восень, верасень ідзе.

## Кастрычнік

Кастры — гара.
Кастры гараць.
Парадак у гаспадара.

## Лістапад

У садзе ў лістападзе
Апошні ліст ападзе.
*Васіль Жуковіч.*

Правообладатель Национальный институт образования

## ГЛЯНЕШ НАЎКОЛА, КРЫКНЕШ УГОЛАС: «МІЛАЕ ЛЕТА, БЫВАЙ!» *(Вера Вярба)*



— Добры дзень, хлопчыкі і дзяўчынкі! Мы вашы новыя сябры. Мяне завуць Васілінка, — павіталася дзяўчынка.

— А мяне — Лянок, — сказаў хлопчык.

— Як цудоўна было летам! — усклікнула Васілінка. — Я адпачывала на дачы ў бабулі з дзядулем.

— А я хадзіў з татам на рыбалку, — дадаў Лянок. — А яшчэ мы вандравалі па роднай краіне на машыне. Але лета развіталася з намі.

— Шкада, што лета скончылася, — сказала Васілінка.

— Так, — пацвердзіў Лянок. — І мы гаворым: «Бывай, лета!»



Правообладатель Национальный институт образования

**Гамо́нка** — размова.
**Кро́чыць** — ісці.
**Быва́й** — так гавораць на развітанне; тое ж, што і *да пабачэння, да сустрэчы*.

Прачытайце назву верша. Як можна яго назваць інакш?

## Бывай, лета!

*Паўлюк Прануза*

Бывай, дарагое
І звонкае лета!
Нясём мы ў класы
Вясёлкі букетаў.

Мы з сонцам дружылі,
З лугамі, з лясамі,
Мы чу́лі, як поле
Шуміць каласа́мі.







Правообладатель Национальный институт образования



Мы бор абуджа́лі
Гамо́нкай вясёлай.
Бывай, лета звонкае!
Крочым мы ў школу.

1. З якой парой развітваюцца дзеці? Які ў іх настрой?
2. Якой пары года дзеці скажуць «прывітанне»?
3. Чаму лета дарагое, звонкае? Якія ўспаміны ў дзяцей пра лета? Разгледзьце малюнкі. Знайдзіце і зачытайце з верша радкі, якімі можна падпісаць малюнкі.
4. Якое свята адзначаецца першага верасня?
5. Падрыхтуйцеся і прачытайце верш выразна.



Як бы вы развіталіся з сябрам? Сястрой? Мамай? Сваёй настаўніцай? Закончыце сказы:

Бывай, ... ... .
Бывайце здаровы, ... ... .
Да пабачэння, ... ... .



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце і адгадайце загадкі.

- Пакалыхаўся на галінцы
І не схаваўся зноў пад ліст,
А ўніз на срэбнай павуцінцы
Спусціўся ён, парашутыст.



- Цэлы дзень лятае,
Усім назаляе.
А ноч настане,
Тады перастане.

*З народнага.*



Прачытайце скорагаворку. Правільна вымаўляйце словы з гукам [р].

У Ларысы і Валеры —
На ліпе арэлі.



Арэ́лі — *рус.*: качели.
Гу́-шка-цца (на арэлях) — *рус.*: качаться (на качелях).
Гайда́ць — *рус.*: качать.
У-ска-ра́-ска-цца — узлезці.
Зу́мкаць — назойліва гудзець.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце назву твора. Як вы ўяўляеце сабе павучковыя арэлі?

## Павучковыя арэлі

*Мікола Чарняўскі*

Стаялі апошнія со-не-чны-я дзянькі́. Каб пагу́шкацца ўволю, павесіў павучок арэлі. За іх за-ча-піў-ся сухі лісток. Вецер гайда́ў яго, калыха́ў, як нейкую пяры́нку.

За-ха-це-ла-ся му́шцы на па-вуч-ко-вых арэлях пагушкацца — села на лісток. Гушкалася, гушкалася — і заснула.

Спа-ло-хаў-ся павучок: «Што з ёю? Можа, ке́пска мушцы стала?»

Пабег, ускара́скаўся па тонкай па-ву-цін-цы да та́ткі, старо́га павука, які непадалёк плёў сетку: можа, каму яшчэ на гамак спа-трэ-бі-цца? Вы́слухаў ён павучка дый ка́жа:

— Дурненькі ты! Яна проста заснула. Блізка халады, зіма. А мухі перад зімою за-сы-на-юць. Толькі мушка з халадамі за-мер-знуць можа. Дык пе-ра-ня-сём яе з арэлямі ды лістком туды, дзе цяпле́й. Вунь у тое дупло, дзе вавёрачка зімаваць сабра-



Правообладатель Национальный институт образования



лася. Думаю, яны пала́дзяць, і мушцы ў яе дупле ме́сцейка зной-дзе-цца.

У-зра-да-ваў-ся павучок, кі́нуўся здыма́ць арэлі. Шкада́, што не пагушкаўся колькі хацеў. Але ж і санлі́вай мушкі шкада. Загі́не — хто ж тады будзе зу́мкаць яму вясною, калі ён возьмецца ткаць свае першыя павуцінкі?

1. Для чаго павучок павесіў арэлі?
2. Навошта мушка села на лісток?
3. Што здарылася з мушкай?
4. Што растлумачыў стары павук перапалоханаму павучку?
5. Раскажыце, як павукі паклапаціліся пра мушку.
6. Чаму павучок выратаваў мушку?
7. Навучыцеся правільна чытаць тэкст.



Правообладатель Национальный институт образования

# ХОДЗІЦЬ ВОСЕНЬ-ЧАРАДЗЕЙКА



— Васілінка, ты любіш восень? — запытаў Лянок.

— Не люблю, — адказала Васілінка, — таму што гэта сумная пара. Сонейка няма. Неба ўсё ў хмарах. Ідзе халодны дождж.

— А я люблю, — адказаў Лянок. — Восень — вельмі прыгожая пара года. Усё рознакаляровае: і дрэвы, і кветкі.

Раскажыце, за што вам падабаецца ці, наадварот, не падабаецца восень.



Правообладатель Национальный институт образования

Жа-ле́й-ка — музычны інструмент у выглядзе дудачкі.

Разгледзьце малюнак. Якой паказана восень? Прачытайце верш і скажыце, як аўтар назваў восень.



## Восень

*Вера Вярба*

Восень, мая чарадзейка,
Ходзіць па лесе, пяе,
І залатая жалейка
Песні разносіць яе.
Восень, прыйдзі́ ты ў школу,
У светлы адчы́нены клас.
Песням і гульням вясёлым
Ты навучыся ў нас.

1. Чаму аўтар называе восень чарадзейкай?
2. Што робіць восень? Хто дапамагае восені?
3. Навошта дзеці запрасілі восень у школу?
4. Чаму дзеці хочуць навучыць яе?
5. Прачытайце верш выразна. Правільна вымаўляйце словы з гукам [дз’].



Правообладатель Национальный институт образования

**Па́церкі** — жаночае ўпрыгожанне на шыю.
**Гро́нкі** — шмат ягад на маленькіх галінках, сабраных разам.
**Частава́цца** — есці тое, чым частуюць.
**Зіхаце́ць** — ззяць.

Прачытайце тэкст. Якой аўтар малюе восень?

## Па лясах і палях

*Міхась Даніленка*

За-ду́-ма-ла восень сабе абновы пашы́ць. Пайшла палямі, лясамі ды пе-ра-ле-ска-мі выбіраць самыя пры-го-жы-я колеры. Асіны і грушы аж чы-рва-не-лі ў пра-ме́-нях сонца, на ўзлессі за-ла-ці-лі-ся бярозы і клёны.

Столькі фа́рбаў на-збі-ра-ла, што выйшаў у яе не-звы-ча́й-ны ўбор.

«Добра было б па́церкі па-да-браць да абновы», — падумала восень і ра́птам убачыла рабіну. Гронкі яе на-лі-ва́-лі-ся чы́рванню, цяжка звіса́ючы до́лу.

Сабра́ла восень яшчэ ру-жо-вых кве́-та-чак верасу, позняга ярка-жоўтага «бабіна-



Правообладатель Национальный институт образования

га лета», сухіх бяссмертнікаў і ўпляла іх у доўгую пры-го-жу-ю касу́.

— Цяпер, здае́цца, усё, — з палёгкай сказала восень і па-гля-дзе-ла-ся ў круглае празры́стае возера.

Ідзе яна па лясах і палях — і ўсё аж зіхаці́ць па-за-ло-тай і чырванню. У прыполе нясе шчодрая восень кру-та-бо-кі-я ан-то-наў-кі, спелыя слівы, духмяныя грушы. Ча-сту́й-це-ся, людзі, на здароўе!..

1. Дзе восень выбірала колеры для свайго ўбрання?
2. З чаго зрабіла пацеркі да абновы? Якія кветкі ўпляла ў касу? Прачытайце.
3. У якое люстэрка паглядзелася восень?
4. Чым частуе восень людзей?
5. Якім словам з верша «Восень» можна назваць гэту пару года?
6. Прачытайце апавяданне выразна.

Намалюйце словамі, якой вы ўяўляеце восень.

Як восень гасцінна запрашае нас пачаставацца? Прыгадайце, калі гавораць: «Частуйцеся на здароўе».



Правообладатель Национальный институт образования

## КЛІЧ НАД ДАЛІНАЮ — ДНІ ЖУРАЎЛІНЫЯ, ПТУШАК НЕ ВЕРНЕШ НАЗАД *(Вера Вярба)*



— Ой, Лянок! — усклікнула Васілінка. — Мне так сумна. Учора мы сям’ёй гулялі па лесе. Збіралі грыбы: грузды і апенькі.

— Чаго ж табе сумна? — запытаўся Лянок. — Грыбоў мала назбірала?

— Грыбоў было многа, — адказала Васілінка. — Але ў лесе вельмі ціха. Не чуваць птушыных галасоў. Таму і сумна. Куды птушкі падзеліся?

Адкажыце на пытанне Васілінкі.



Правообладатель Национальный институт образования

Вы́рай — цёплы край, куды ляцяць на зіму птушкі.
Мкну́цца — хутка рухацца, імкнуцца.
Клін — форма палёту чарады некаторых відаў птушак у небе.

Паслухайце верш. Куды адлятаюць увосень жураўлі?

## Адлёт жураўлёў

*Якуб Колас*

Заміра́е лета,
Заціха́юць далі,
Сірацé́е рэчка,
Халадзé́юць хвалі.

У бязме́жным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі ў вырай
Мкнуцца над лясочкам.





Правообладатель Национальный институт образования

Ме́ншыцца шнурочак,
У паднябе́ссі тае,
Вось ледзь-ледзь чарне́е,
Міг — і прападае.

1. Які настрой выклікаў у вас верш? Якія словы перадаюць гэты настрой?
2. Пра якія змены ў прыродзе восенню гаворыцца ў вершы?
3. Прачытайце, як адлятаюць жураўлі ў вырай.
4. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Верш трэба чытаць павольна ці хутка? Весела ці сумна?
5. Вывучыце верш на памяць.

Прачытайце прыкметы восені. Як вы іх зразумелі?

- Жураўлі ляцяць нізка — зіма блізка.
- Увосень пагод восем.
- Восенню многа павуціны — на яснае надвор'е.

**Плі́ска** — невялікая птушка атрада вераб'іных з доўгім і вузкім хвастом.
**Само́тны** — сумны, адзінокі.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце назву апавядання. Пра раннюю ці познюю восень гэты тэкст?

## Восень на парозе

Учора з раніцы і да самага вечара дажджы́ла. А сёння зусі́м па-лі́пеньску спя-ко-тлі-вы дзень. І цішыня. Толькі дзесьці звонка ці́нькаюць сінічкі. Помніце такую прыказку: «У верасні сініца ў госці восень запраша́е»?

Восень — на парог, а шма-тлі́-ка-е крылатае войска — у вырай. Першымі ў за-мор-скі-я краіны а-для-та́-юць стрыжы і ластаўкі. За імі вы-праў-ля́-ю-цца плі́скі, буслы́, шпакі́... А ў канцы верасня адлятаюць жураўлі.

*Паводле Уладзіміра Ягоўдзіка.*

1. Як мянялася надвор'е ўвосень? Знайдзіце адказ у тэксце. Якая прыкмета з прачытаных падыходзіць да гэтай часткі твора?
2. Прачытайце прыказку. Як вы яе разумееце?
3. Якія птушкі адлятаюць у вырай першыя?
4. Калі адлятаюць у вырай жураўлі?

Намалюйце слоўныя карціны да тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

## ХОДЗІЦЬ ВОСЕНЬ З ЖОЎТЫМ КЛУНКАМ, НОСІЦЬ ДРЭВАМ ПАДАРУНКІ *(Максім Лужанін)*



*Станіслаў Жукоўскі.* Восень у сядзібе



*Кастусь Качан.* Позняй восенню



Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце карціны беларускіх мастакоў. Адкажыце на пытанні.

1. Якая пара года намалявана?
2. Якімі колерамі карысталіся мастакі, каб перадаць адметныя прыкметы ранняй і позняй восені?
3. Чаму неба на карцінах рознага колеру?
4. Якія пачуцці выклікаюць у вас гэтыя карціны? Чаму?

Вусна складзіце невялікае выказванне па адной з карцін. Прыдумайце загаловак.

Словы для выкарыстання: залатая восень, сумная пара, ясны дзень, дрэннае надвор'е, пачатак восені, глыбокая восень, сонца, пахмурнае неба, напоўненыя дажджом хмары, блакітнае неба, лёгкія воблачкі, голыя дрэвы, залатое ўбранне, шамаціць пад нагамі, асенняе лісце.

Бры-зглі́-на — кустовая расліна, *рус.*: бересклет.

Бу-ра-ло́-мі-на — дрэва, паваленае бурай.

Хмызня́к — кусты, зараснік.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце загаловак тэксту. Ці здагадаліся вы, пра што будзе ісці гаворка ў тэксце? Паслухайце і скажыце, у чым прыгажосць лістападу.

## Лістапад у лесе

*Рыгор Ігнаценка*

У лесе лістапад. Стра-ка́-ты-я дрэвы з хмы-зня-ка́-мі паволі скі́-два-юць долу свой дарагі асенні ўбор.



Хораша ў гэты час прысесці дзе-небудзь на сухі пянёк або бураломіну і па-на-зі-ра́ць за гэтай прыва́бнай у-ра-чы́-ста-сцю ў прыродзе.

Вось з бярозкі адзін лісток вінтом да зямлі ўкру-чва-е-цца. Другі, па-ска-ра-ю-чы абароты, ва́лікам па ветры коціцца. Трэці матыльком пырхае над па-ры-жэ-лай травою, доўга вы-бі-ра-ю-чы сабе месца. А гэты, бу́ры, лёгкім галубком пераляцеў усю прасторную палянку і паволі апусціўся ў канцы яе пад чырвоны куст брызгліны.

У розных дрэў па-рознаму лісце апада́е.



Правообладатель Национальный институт образования



Я́сені скі-два-юць лісце зялёнае — быццам тыя ца-ца-чны-я драбі́нкі з блакітнага неба злята́юць долу.

Ёсць свае а-са-блі-ва-сці ў асіны, дуба, рабіны.



Нямá лістоў, якія а-дноль-ка-ва б ападалі. Колькі б іх ні было ў лесе — і кожны з іх па-свойму з асенняй зямлёй су-стра-ка́-е-цца.

1. Як адбываецца лістапад у лесе? Прачытайце.
2. Як ападаюць лісткі з бярозы?
3. Як скідвае лісце ясень?
4. Што аўтар гаворыць пра асаблівасці лістападу ў розных дрэў?

Адгадайце загадку. Якія дрэвы ўвосень не скідваюць сваё ўбранне?



Я засяваю долігліцай,
спрадвеку слаўлюся жывіцай.

*Анатоль Клышка.*



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце народныя прыкметы. Якой пары года яны адпавядаюць? Што гаворыцца ў іх пра кожны асенні месяц?

- Як настаў верасень, дык туман кожны дзень.
- У верасні ліст на дрэве не трымаецца.
- Кастрычнік ходзіць па краю ды гоніць птушак з гаю.
- Кастрычнік зямлю беліць, а лес залоціць.
- Лістападаўскія ночы да снегу цёмныя.
- У лістападзе гола ў садзе.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

1. У якім творы вы прачыталі пра развітанне дзяцей з летам? Якое слова гаварылі дзеці лету на развітанне? Каму можна сказаць «бывай»?

2. Як называецца твор, у якім павучок любіў пагушкацца на арэлях? Успомніце скарагаворку пра арэлі. Правядзіце спаборніцтва «Хто хутчэй раскажа скарагаворку?».



Правообладатель Национальный институт образования

**3.** З якога твора ўзяты радкі?

«Меншыцца шнурочак,
У паднябессі тае...»

Успомніце, як ляцяць жураўлі. Які яшчэ твор расказвае, як птушкі адлятаюць у вырай?

**4.** У якім вершы аўтар называе восень чарадзейкай? Прачытайце выразна верш «Восень» В. Вярбы. Назавіце твор, у якім восень шукае сабе абновы. Хто яго аўтар?

**5.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце невялікае апавяданне па кожным малюнку.







Правообладатель Национальный институт образования



О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!

*Пятро Глебка.*

# МАЁЙ РАДЗІМЫ ДЗІЎНЫ СВЕТ

Правообладатель Национальный институт образования

## ЁН РАДЗІМАЮ ЗАВЕЦЦА — НЕПАЎТОРНЫ ГЭТЫ КРАЙ *(Міхась Пазнякоў)*



— Мы летам былі на радзіме маіх дзядулі і бабулі, — паведаміў Лянок. — Там так цудоўна, птушкі спяваюць, рэчка.

— А я, на жаль, ніколі не была на радзіме маіх продкаў, — сказала Васілінка.

— Шкада. Спадзяюся, што ты яшчэ там пабываеш і не аднойчы. Але я рады, што ўсе мы жывём у адной краіне — нашай роднай Беларусі.

Крыля́е — ляціць.
Квітне́е — становіцца прыгажэйшым.



Правообладатель Национальный институт образования



Што для вас значыць Радзіма? Прачытайце верш і скажыце, якой вы ўяўляеце Радзіму.

## Беларускі край

*Анатоль Зэкаў*

Над зямлёй крыля́е бусел.
Скачуць конікі ў траве.
Дзед жыве ў Беларусі,
І бабуля тут жыве.

Тут жывуць і тата з мамай,
Брацік мой, мая сястра.
Тут жыву і я такса́ма.
Беларусь — наш родны край.

Край лясоў, лугоў і рэчак,
Ён квітне́е з году ў год,
І на свеце будуць вечна
Край наш родны і народ.

1. Якія малюнкі беларускай прыроды можна ўявіць, калі чытаеш верш?
2. Хто са сваякоў прыгадваецца ў вершы? Прачытайце верш выразна.
3. Растлумачце сувязь паміж словамі: *родны, род, народ, Радзіма.*



Правообладатель Национальный институт образования

Пераўтвара́ецца — становіцца іншым.
Падхапі́ў — *рус.*: подхватил.
Спало́халася — *рус.*: испугалась.

Разгледзьце малюнкі. Што здарылася з Кропелькай? Чым скончылася яе падарожжа? Чаму гэта здарылася? Падумайце, калі будзеце чытаць твор.

## Кропелька

*Алена Кобец-Філімонава*

Жыла-была дажджавая Кропелька. Яна нястомна працавала. Ка́пне з хмары на зямлю. Напоіць яе. А потым вы́парыцца і зноў у паветра ўзля-ціць. Збяру́цца такія кропелькі ў адно воблака. Калі іх стане вельмі многа, воблака цямнее ад цяжа́ру, пе-ра-тва-ра-е-цца ў хмару. Усе кропелькі, не ўтры-ма́ў-шы-ся, па́даюць уніз праліўны́м дажджом.





Правообладатель Национальный институт образования

Аднойчы Кропелька не паспе́ла даляце́ць да зямлі. Яе падхапі́ў Паўночны Вецер. Піча́ў ён на-сві-стваць пра незвычайную казачную краіну, з якой прыляцеў. Пачаў упрошваць Кропельку кі́нуць родны кут і паляцець разам з ім. Згадзі́лася Кропелька.

Тады Паўночны Вецер сарва́ў з бярозы лісцік і панёс на ім Кропельку ў далёкі край.

Прыляцела Кропелька. І што ж?

Убачыла яна шэрае халоднае неба. І такое ж халоднае сонца. І такую ж халодную, заснежаную зямлю. Пачала Кропелька замярзаць. Яшчэ крыху — і стала б яна ледзяшом.



Спа-ло-ха-ла-ся Кропелька, што загі́не. Пачала прасіць Паўночны Вецер адне́сці яе назад на радзіму.

Зжаліўся Паўночны Вецер. Аднёс яе.



Правообладатель Национальный институт образования

Кропелька не магла дачака́цца, калі прызямліцца бярозавы лісцік. Яна скаці́лася з яго на родную цёплую зямлю гарачай слязой, каб ніколі больш не расставацца.

1. Як працавала Кропелька? Куды паклікаў Кропельку Паўночны Вецер?
2. Як вы думаеце, чаго чакала Кропелька? Якую краіну яна ўбачыла?
3. Чаму Кропелька не магла дачакацца, калі прызямліцца бярозавы лісцік?
4. Ці спачувалі вы Кропельцы? У які момант хваляваліся за яе? Радаваліся?
5. Знайдзіце сказ з выразам «халоднае сонца». Чаму аўтар назваў сонца халодным?
6. Прачытайце твор. Падзяліце яго на часткі па плане. Перакажыце твор у групах.

П л а н

1. Кропелька працуе ў родным краі.
2. Кропелька пакідае родны кут.
3. Кропелька ў далёкім краі.
4. Вяртанне Кропелькі на родную зямлю.

Якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да гэтага твора? Раскажыце. Прыдумайце працяг твора.



Правообладатель Национальный институт образования

## БЛАКІТНЫЯ ХВАЛІ БЕЛАРУСКАГА ЛЁНУ



— Васілінка, у цябе такі прыгожы ўбор! — усхвалявана адзначыў Лянок.

— Так, — задаволена ўсміхнулася Васілінка, — гэта нацыянальнае адзенне беларускіх жанчын: спадніца, вышываная кашуля, фартух.

— А ў маёй бабулі ёсць прадзедава кашуля і штаны, — паведаміў Лянок.

— А яшчэ мне бабуля казала, што гэта ўсё не куплялі, а рабілі самі, — дадала Васілінка.

— Няўжо? — здзівіўся Лянок.

— Так, так. Гэта ўсё калісьці было раслінай.



Правообладатель Национальный институт образования



Паслухайце беларускую народную песню «Ох, і сеяла Ульяніца лянок» і праспявайце разам.



1. Ох, і сеяла Ульяніца лянок,
   Ох, і сеяла Іванаўна лянок.

*Прыпеў:* Ох, сэрца лянок!
Мая радасць ты, лянок,
Усё бялюсенькі кужалёк.



2. Ох, палола Ульяніца лянок,
   Ох, палола Іванаўна лянок.



3. Ох, і рвала Ульяніца лянок,
   Ох, і рвала Іванаўна лянок.



4. А сарваўшы, у снапочкі ставіла,
   А сарваўшы, у снапочкі ставіла.



5. Ох, і слала Ульяніца лянок,
   Ох, і слала Іванаўна лянок.



6. Ох, і прала Ульяніца лянок,
   Ох, і прала Іванаўна лянок.



Правообладатель Национальный институт образования

7. Ох, і ткала Ульяніца лянок.
Ох, і ткала Іванаўна лянок.



8. А саткаўшы, ды сарочак
нашыла,
А саткаўшы, ды бялёных
нашыла.



З якой расліны вырабляюць на Беларусі тканіну? Паслухайце верш. Чаму ў мамы добры настрой?

## Лён-ляночак

*Мікола Чарняўскі*

На сцяблі́нцы кожнай —
Сіненькі званочак:
Хараша на ра́нку
Лён расцвіў, ляночак.

Мама сце́жкай крочыць.
Сонцам ззя́юць вочы:
Добры ў нашай мамы
Вырас лён-ляночак.



Правообладатель Национальный институт образования

Ветрык павява́е,
Шэпчацца з ляночкам.
Мама нам ляночку
Падпляла́ ў вяночкі.

— Расцвіта́йце, дзеці,
Нібы лён-ляночак —
Будзе светла ў свеце
Ад блакі́тных вочак!



1. Прачытайце радкі верша, якімі можна падпісаць малюнак.
2. Прачытайце словы маці. Якія пачуцці перадае аўтар?
3. Якія словы верша ствараюць сонечны, ясны настрой? Прачытайце верш выразна.
4. Што нагадвае поле, калі цвіце лён? Закончыце выказванні:
   - Поле лёну блакітнае як … .
   - Кветка лёну блакітная як … .
5. Што рабілі жанчыны, каб з ільну атрымаць тканіну і пашыць адзенне? Якія якасці характару патрэбныя ім для гэтага? (Працавітасць, настойлівасць, узаемадапамога.)



Правообладатель Национальный институт образования



6. Разгледзьце карціну мастака Мікалая Багданава-Бельскага «Дзеці ў хаце».
У што апранутыя дзеці? З чаго пашыта іх адзенне? Які яшчэ прадмет з ільняной тканіны бачны на карціне?



Разгледзьце выявы ручнікоў. Што можна сказаць пра майстрых, якія іх ткалі і вышывалі? Ці ёсць у вашым доме беларускі ручнік? Раскажыце, які ён, хто яго зрабіў.





Правообладатель Национальный институт образования

**Схава́лася** — *рус.*: спряталось.
**Заўва́жыў** — *рус.*: заметил.

Прачытайце загаловак твора. Як, па-вашаму, можа выглядаць хмарчын ручнік? Прачытайце апавяданне. Як называецца хмарчын ручнік?

## Хмарчын ручнік

Скон-чы-ла-ся вясна, і пачалося лета. Аднойчы мя-дзве-дзі-ка Патапку памылі, вы́церлі чыстым ручніком. Маці пачала прыбіра́ць у хаце, а ён пры-ма-сці́ў-ся ля акна.

Нечака́на вы́плыла хмарка. Паліў цёплы летні дожджык. Патапка бачыў, як ён мые дрэвы і кусты.

Хмарка паплыла́ далей. Зноў выглянула сонца. І Патапка заўважыў на небе… каляровы ручнік.

— Мамачка! — крыкнуў ён. — Глянь: хмарка ручнік пакінула!

— Дзе ён?

— Вунь, на небе, — паказаў лапай Патапка і дадаў:

— Я ведаю навошта. Каб дрэвы, па-мыў-шы-ся, маглі вы-цер-ці-ся.



Правообладатель Национальный институт образования

Тут сонейка схава́ласяᅠ— і ручнік прапа́ў.

— А дзе ручнік? — захныкаў Патапка.

— Чаго ты плачаш, дурненькі? — пачала суцяша́ць маці. — Сам жа сказаў, што хмарка пакінула ручнік, каб дрэвы маглі выцерціся пасля дажджу. Дрэвы выцерліся, і хмарка забрала свой ручнік.

Маці зага́дкава ўсміх-ну-ла-ся:

— Дык ты ведаеш, пра які ручнік я кажу?

— Хма́рчын ручнік? — адказаў Патапка. — Я здагада́ўся: гэта — вясёлка.

*Паводле Расціслава Бензерука.*

1. З чым Патапка параўнаў вясёлку? Чаму?
2. Навошта, на думку мядзведзіка, хмарка пакінула ручнік?
3. Куды дзеўся ручнік? Прачытайце.
4. Прачытайце выразна па ролях размову мамы і мядзведзіка Патапкі.



Як вы звяртаецеся да мамы? Якія словы ўдзячнасці ёй гаворыце? (Любая мамачка, матулечка, дзякую табе, я табе вельмі ўдзячны.)



Правообладатель Национальный институт образования

# ХЛЕБ — УСЯМУ ГАЛАВА



У час сняданку ў школьнай сталовай Васілінка заўважыла лустачку хлеба на падлозе.

— Лянок, глядзі, у некага хлеб упаў, — гукнула дзяўчынка сябра.

— Трэба хуценька падняць, каб хто не наступіў, — сказаў Лянок і пацягнуўся за лустачкай.

— Малайчына, Лянок, — сказала Васілінка. — Толькі я не разумею, чаму лустачку не падняў той, у каго яна ўпала?

Адкажыце на пытанне Васілінкі.

Дамо́вімся — *рус*.: договоримся.
Кро́іць — *тут*: разразаць.



Правообладатель Национальный институт образования

Паслухайце пачатак твора і скажыце, якая стра́ва, па-вашаму, самая галоўная.

## Хлеб

*Леанід Улашчанка*

Была нядзеля. Гаспадыня накрыла святочны стол. Чаго толькі на ім не было: і грэцкая каша, і сала́та, і сма́жанае мяса, і нават фар-шы-ра-ва́-ны шчупа́к. Усе стравы атрымаліся вельмі смачныя. Але не паспела гаспадыня выйсці, як яны за-спра-ча́-лі-ся паміж сабою, якая з іх самая галоўная.

Кожная была ўпэўнена, што яна найважнейшая. Як тут быць? «А давайце дамовімся, — пра-па-на-ва́-лі раптам агуркі, — каго першага людзі возьмуць у рукі, той і галоўны». На тым і пагадзі́ліся.



Гаспадыня запрасіла гасцей да стала. Калі́ ўсе паселі, самы стары і паважа́ны дзед агле́дзеў стол і запыта́ўся, ці ў кожнага ўсё ёсць.



Правообладатель Национальный институт образования

Потым яшчэ раз зірнуў на стол і хі-тра-ва-та ўсміхнуўся:

— Гаспадынька, а нешта ж я не бачу на стале самага галоўнага...

— Чаго? — падхапíлася гаспадыня.

— Паглядзí, сама ўбачыш...

Жанчына акíнула ўважлівым вокам стол і пля́снула далонямі:

— Гэта ж трэба — хлеб не падала́! Так за-кру-ці-ла-ся, што пра самае галоўнае забылася.

Людзі за сталом заў-смі-ха-лі-ся, па-ве-ся-ле-лі, а гаспадыня прынесла вялікі бохан свежага духмянага хлеба і падала дзеду. Той узяў нож і пачаў лусту за лустай кроіць яго. Рукі гасцей самі сабой па-ця-гну-лі-ся да хлеба.

Усе стравы сцíхлі.

Хлеб! Ён ніколі не пры-я-да́-е-цца і ніколі не лішні. Ён і ёсць усяму галава.

1. Пра што заспрачаліся стравы? Хто перамог у спрэчцы? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

2. Прачытайце апошні сказ твора. Чаму так кажуць пра хлеб?
3. Падзяліце твор на тры сэнсавыя часткі. Пра што гаворыцца ў кожнай частцы?
4. Прачытайце па ролях у парах размову гаспадыні з дзедам.



Якія хлебныя вырабы вы любіце? Каму вы ўдзячныя за хлеб?
Паслухайце верш і скажыце, чым пахне хлебная скарынка.

## Хлебная скарынка

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Пахне
Хлебная скарынка
Цёплым ветрыкам,
Хваінкай,
Летнім дожджыкам
Грыбным,
Лугам,
Полем аржаным,
І асенняй пазалотай,
Ды натхнёнаю работай.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Які водар адчуў аўтар у хлебнай скарынцы?
2. Пра што трэба памятаць, калі бярэш у рукі хлеб?
3. Які запавет продкаў выказаны ў прыказцы?
   - **Калі хочаш хлеб меці,
     то трэба зямліцы глядзеці.**
4. Вывучыце верш на памяць.
5. Разгледзьце карціну Івана Шышкіна «Жыта». Якія словы з верша можна выкарыстаць для яе апісання?





Спакон веку беларусы паважліва ставяцца да хлеба. У адносінах да хлеба трэба выконваць пэўныя правілы. Падумайце якія.



Правообладатель Национальный институт образования

## МОРАМ ЖЫТА РАЗЛІВАЕЦЦА — НЕЛЬГА ПОЗІРКАМ АБНЯЦЬ *(Васіль Жуковіч)*



— Ты што чытаеш, Васілінка? — гукнуў дзяўчынку Лянок.

— Чытаю верш пра тое, як сеялі абаранкі, — падняўшы галаву, сказала Васілінка.

— Хіба абаранкі сеюць? — здзівіўся Лянок.

Як вы думаеце, пра што на самай справе чытала Васілінка?

Растлумачце прыказку.

- З маленькага зерня — вялікі хлеб.

Чаму хлебнае зерне называюць залатым?

Жніво́ — час, калі жнуць хлеб.
Смуга́ — *рус.*: дымка.



Правообладатель Национальный институт образования



Прачытайце твор і скажыце, якіх колераў бывае поле.

## Татава поле

*Фама Рамашка*

Тата ў Любачкі — ме-ха-ні-за́-тар. Ён умее вадзіць і трактар, і аўтамашыну, і камбайн. За колькі дзён да жніва́ тата ўзяў дачку́ ў поле. Цудоўна там летам. Куды ні глянь — каласы...

— Якое прыгожае тваё поле, тата! — сказала Любачка. — Усё жоўтае-жоўтае!

— А ведаеш, дачушка, колькі колераў у поля? — запыта́ўся тата.

— У маі бывае зялёны.

— А яшчэ?

Заду́малася Любачка.

— Ну, тады, калі я вы-я-зджа́-ю ў поле на тра́ктары, які колер? — спытаў тата.

— Чорны!

— А спя-ко-тным днём, калі поле заця́гнута смугой?

— Блакітны!

— Ёсць яшчэ адзін колер.



Правообладатель Национальный институт образования

Зноў задумалася Любачка.

— Калі прыходзіць зіма, поле…

— Белае!

— Гэта добра, дачушка, што ў поля ёсць і белы колер. Калі снегу многа, тады і ўраджай бага́ты. Снег — цёплая коўдра для поля… Шалясце́ла пад лёгкім ветрам калоссе. Любачка стаяла і ра́давалася, што татава поле нібыта вясёлка.





Правообладатель Национальный институт образования

1. Кім працуе тата Любачкі? Што робіць механізатар?
2. Якім убачыла поле Любачка? Пра якія колеры поля расказаў дзяўчынцы тата?
3. Прачытайце, чаму белы колер для поля важны. Раскажыце, як вырошчваюць хлеб. У чым адказнасць гэтай працы?
4. Прачытайце тэкст па ролях у парах. Пры чытанні перадавайце пачуцці павагі да роднай зямлі, удзячнасці за тое, што зямля нас корміць.
5. Адгадайце загадкі.
   - Сто братоў адным поясам падпаразаны.
   - Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала — зноў жоўтым стала.
   - Не мора, а хвалюецца.





Правообладатель Национальный институт образования

*Саламяны павук* — упрыгожанне з саломы. Што нагадвае саламяны павук? Што яшчэ можна рабіць з саломы?



Дужэ́ць — станавіцца моцным.
Го́жа — тое, што і прыгожа.

Прыгадайце, назва якой расліны нагадвае імя хлопчыка.
Паслухайце верш. У ім расказваецца пра расліну ці пра хлопчыка?

## Васілёк

*Васіль Жуковіч*

Ля жывой дарогі,
з краю збажыны́,
сіні васілёчак
сніў зямныя сны.



Правообладатель Национальный институт образования

Васілька пры ніве
вецер калыхаў,
жаваранак песню
васільку спява́ў.

Сонейкам сагрэты,
рос ён і дужэў,
пад ласка́вым небам
гожа расквітне́ў.

Адквітне́е лета,
восень праляціць,
і зямля навокал
снегам зазіхці́ць.

Толькі травень прыйдзе,
сонечны дзянёк —
ля дарогі ўзы́дзе
зноўку васілёк.



1. Дзе рос васілёк? Хто быў побач з васільком? Прачытайце.
2. Знайдзіце ў вершы словы, якія «ажыўляюць» нежывыя з’явы.
3. Як вы разумееце выразы: «сніў зямныя сны», «ля жывой дарогі»?
4. Прачытайце верш выразна.



Правообладатель Национальный институт образования

## ЗЯМНЫ ПАКЛОН ТАБЕ, РАДЗІМА, ТВАІМ ПАЛЯМ, ТВАІМ ЛЯСАМ *(Пятро Глебка)*



— Лянок, паглядзі, што я знайшла ў інтэрнэце! — паклікала Васілінка хлопчыка. Лянок падышоў да манітора, і дзеці пачалі глядзець ролік. З іх пакоя раз-пораз даносіліся словы: «Якія прыгожыя белыя птушкі», «на крылах чорная палоска», «шукаюць на балоце жабак», «чырвоныя дзюбы», «крылы як ветразі».

Пра якую птушку быў гэты відэаролік? Ці бачылі вы бусла? Раскажыце.

Шкадава́нне — *рус.*: сожаление.
Цыба́тыя — тонкія і доўгія.
Напагато́ве — у гатоўнасці.



Правообладатель Национальный институт образования

Паслухайце апавяданне і скажыце, якая птушка ўпрыгожыла луг.

## Шкадаванне

Стаю́ пасярод зялёнага лугу — ні дрэўца вакол, ні кусціка. Няма за што вочку зачапіцца.

Здае́цца, быў бы мастаком — абавязкова пайшоў бы далей, не за-тры́-млі-ваў-ся, бо што тут маляваць? Ну не траву ж, праўда?

Раптам чу́ю: шух-шух! Бусел зусім нізка нада мной праляцеў і, вы́-ста-віў-шы свае цыбатыя ногі, непадалёку апусціўся на луг. Уважліва паглядзе́ў на мяне: маўля́ў, а ці не прыйшоў ты, бра́це, па маіх жа́бак ды конікаў? Паглядзеў — і за справу. Ногі ў траве пе-ра-стаў-ля-е, быццам па вадзе ідзе. Толькі доўгая дзю́ба — уверх-уніз, уверх-уніз, уверх-уніз, як кап’ё, заўсёды, заўсёды на-па-га-то-ве.

І адразу змяні́ўся, пахарашэў луг дзякуючы гэтай велічнай, прыгожай птушцы. І як тут не пашкадава́ць, што я не мастак?

*Паводле Алеся Бадака.*



Правообладатель Национальный институт образования



*Мікалай Ісаёнак*. Беларускі прастор

1. Чаму пахарашэў луг?
2. Разгледзьце карціну. Прачытайце тую частку твора, якая адпавядае карціне.
3. Чаму нашу Радзіму называюць «зямлёю пад белымі крыламі»? Што сімвалізуе бусел?

Спрадве́ку — здаўна.



Правообладатель Национальный институт образования

Паслухайце верш. Якія беларускія краявіды замілавалі аўтара?

## Беларускія краявіды

*Анатоль Грачанікаў*

Беларускія
Краявіды…
Перазвоны
Азёр і бароў,
Над пале́ткамі
Бульбы і жыта —
Песня
Ве́лічных курганоў.





Правообладатель Национальный институт образования



Гэта наша
Зямля дарагая,
Гэта нашы
Лугі і палі,
Над якімі
Спрадвеку лунáе
Бусел —
Сімвал
Бяссмерця
Зямлі.

1. Знайдзіце словы, якімі выказана любоў да роднай зямлі.
2. Якімі словамі з верша можна падпісаць малюнкі?
3. Прачытайце прыказкі. Якія пачуцці перадалі людзі ў іх?
   - Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай.
   - Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
   - Родная зямля — маці, чужая старонка — мачыха.
4. Вывучыце верш на памяць.



Правообладатель Национальный институт образования

Якая любімая беларусамі расліна ўзгадваецца ў вершы? Ці ведаеце вы, як вырошчваюць бульбу? Раскажыце. Якія стравы з бульбы вы любіце?

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

1. Назавіце персанажаў. Успомніце аўтараў і назвы твораў.



2. Са слоў складзіце прыказкі. З якімі творамі яны суадносяцца?

*Няма, крыніцы, смачнейшай, з, вадзіцы, як, роднай.*



Правообладатель Национальный институт образования

*Калі, меці, хочаш, глядзеці, трэба, хлеб, то, зямліцы.*
*Ідзі, ў, рай, там, родны, пад, край, і, елкаю.*
*Для, птушачкі, сваё, мілае, ўсякай, гняздо.*

**3.** Размясціце радкі ў такім парадку, каб атрымаўся ўрывак з верша А. Вольскага.

я давесці бяруся:

Усім на зямлі

ад маёй Беларусі!

няма прыгажэй

**4.** Прыгадайце творы, у якіх гаворыцца пра хлеб. Чаму да хлеба прынята ставіцца з вялікай павагай? Што вы зробіце, калі ўбачыце, што ўпала скібачка хлеба? Якія яшчэ правілы трэба выконваць у адносінах да хлеба?

**5.** Даведайцеся і раскажыце пра родныя мясціны вашых продкаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Пяюць крыніцы і бары.
Мелодыя — жывая.

*Уладзімір Мазго.*

# ЖЫВАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ



Правообладатель Национальный институт образования

Матылёк — *рус.*: бабочка.
Слімáк — *рус.*: слизень.

Назавіце насякомых, адлюстраваных на малюнках. Каго з іх вы назіралі? Раскажыце. Прачытайце верш.

## Хто жыве ў траве?

*Ніна Галіноўская*



Хто жыве, хто жыве
ў высокай траве?
Там і мошкі, і жучкі,
матылькі і павучкі.
А хто скача, нібы коннік?
Рэкардсмен па скоках — конік.



Чый каптáнік
у гарошкі
і прыгожая галоўка?
Гэта божая кароўка.



Лежабоку
слімака
не адрозніш
ад лістка.





Правообладатель Национальный институт образования



Пчолка шэпча
з канюшы́най:
«Даць нектару
мне павінна».



Непаседа страказа —
то наперад, то назад.
Кружыцца, як верталёт.
Не патрэбен ёй пілот.



Асцярожна: у траве
вельмі шмат хто жыве.

1. Пра якія асаблівасці насякомых гаворыць аўтар? З кім параўноўвае іх?
2. Чаму аўтар называе слімака лежабокам, а страказу — непаседай? Ад чаго засцерагае аўтар?
3. Прачытайце верш выразна, апошнія радкі — з перасцярогай. Каго яшчэ можна сустрэць у траве? Раскажыце.
4. Прачытайце прыказкі. Якія асаблівасці насякомых прыкмецілі людзі ў прыказках?

   - Зімовы дзянёк што камароў насок.
   - Мурашка маленькая, ды горы варочае.
   - Адна пчала мёду не наносіць.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Дапоўніце параўнанні, ужыўшы назвы насякомых.

Працавіты як ... .
Слізкі як ... .
Гудзе як ... .
Скача як ... .

6. Адгадайце загадкі.




- Семсот муляроў збудавалі дом без вуглоў.
- У цёмнай цямніцы панны кросны ткуць.




Беларускія дзеці складаюць і вымаўляюць заклічкі — невялікія вершы. Прачытайце заклічку і скажыце, якую асаблівасць слімака заўважылі дзеці.

Слімак, слімак,
Выпусці ражочкі,
Дам мукі́
На піражочкі.

Складзіце заклічку пра пчалу.

Пчолачка, пчолка,
Ляці на 
Будуць рады
твае  .



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце скорагаворку М. Чарняўскага. Правільна вымаўляйце гукі [ч], [ц’], [дз’].

Дзве жвавыя вавёрачкі
Скакалі праз вяровачкі.
А трэцяя вавёрачка
Шукала: «Дзе вяровачка?»

Па-спы-та́ць — паспрабаваць на смак.
Па-ма́-цаць — дакрануцца рукой.
Про́цьма — многа.

Прачытайце назву твора. Разгледзьце малюнак. Аб чым пойдзе гаворка ў творы?

## У арэхах

*Рыгор Ігнаценка*

Пайшлі мы аднойчы з Кастусём у арэхі. Па дарозе да-мо-ві-лі-ся ні-во-дна-га арэха не е́сці, каб потым палічы́ць, хто болей нарваў.

Ціха ў канцы лета ў лесе. Хіба толькі дзе мыш у апалым лі́сцы піскне ці вецер у вер-ха-ві-нах дрэў прашуміць. Пра-ко-ці-цца марской хваляй і тут жа сці́хне.

Праз нейкі час чу́ю: справа арэх шчоўкнуў. Значыць, усё ж Кастусь не ўтрыма́ўся,



Правообладатель Национальный институт образования

каб не па-спы-таць. Потым другі шчаўчок, трэці. Я ж трымаюся, не спрабую. Няхай, думаю, тады паглядзім, у каго болей будзе.

А Кастусь між тым усё грызе арэхі ды грызе. Я памацаў: амаль ужо дзве кішэні поўныя. Ну што ж, думаю, за́раз можна і мне паспытаць. Сарву шышачку — што ў кішэню, а што — у рот.

Доўга я так арэхі рваў. А Кастусь увесь гэты час грыз іх.

На-рэ-шце вырашыў я па-гля-дзець. Мо-жа, у яго там арэхаў процьма, што ён працяг-вае есці іх не шкадуючы? Па-ды-хо-джу





Правообладатель Национальный институт образования

асцярожна да куста, дзе арэхамі шчоўкаюць. Гляджу — аж гэта ніякі не Кастусь, а вавёрка. Пава́жна сядзіць на шырокім пні і арэх грызе. А што за пры-га-жу́-ня! Футра на ёй рыжае, грудка снежна-белая, мяккі пушысты хвост, вялікія цёмныя вочкі. Так і хо-ча-цца падысці да звярка ды па мяккай поўсці пагладзіць.

Пе-ра-мо-жцам, вядома, Кастусь стаў. Як і дамовіліся мы, ён ні-во-дна-га арэха не з'еў.

1. Аб чым дамовіліся хлопчыкі? Хто ўвёў хлопчыка ў зман?
2. Хто выйшаў пераможцам? Чаму?
3. Які́м выглядаў лес у канцы лета? Прачытайце.
4. Прачытайце, як выглядала вавёрка.
5. Падрыхтуйцеся і перакажыце твор па плане ў групах.

П л а н

1. Ніводнага арэха не есці.
2. Кастусь усё ж не ўтрымаўся.
3. Зараз можна і мне арэхаў паспытаць.
4. Гэта ніякі не Кастусь грызе арэхі.
5. Пераможцам стаў Кастусь.



Правообладатель Национальный институт образования

## ЭХ, КАБ ЗНАЛІ МЫ ЛЯСНУЮ МОВУ, КОЛЬКІ КАЗАК МЫ ПАЧУЛІ Б НОВЫХ!

*(Іван Муравейка)*



— Васілінка, колькі таямніц хавае лес! Так хочацца пра іх даведацца! Але я так рэдка бываю ў лесе, — засмучана вымавіў Лянок.

— У лес мы абавязкова сходзім са сваімі бацькамі. Але шмат лясных таямніц нам можа паведаць кніга. Давай пачытаем...



Якія казкі пра лясных звяроў вы чыталі? Паслухайце казку і скажыце, якія лясныя жыхары дапамагалі Алесіку.



Правообладатель Национальный институт образования

## Сказ пра тое, як Алесік заблукáў аднойчы ў лесе

*Генадзь Аўласенка*

Нéяк раз малы́ Алесік за грыбамі ў лес пайшоў. Ён ішоў, ішоў па лесе, са сцяжынкі прэч сышоў. Як сышоў — так і пайшоў, зноў сцяжынкі не знайшоў.

Вось якая незадáча! Ну куды ісці, куды? Пад ялі́най стаў і плача — хто ж пазбáвіць ад бяды?

Заяц з лесу выбягáе, да Алеся падбягае.

— Не бяду́й, — крычыць, — Алесік! Ты пабудзь са мной у лесе! Будзем разам мы гуляць: і скакаць, і танцаваць!

І, узяўшы лапы ў бокі, Заяц так пайшоў у скокі, што Алесік не стрымáўся, замест плáчу — рассмяяўся. Ну а потым усміхну́ўся, вакол сябе азірну́ўся, уздыхнуў і кажа:

— Не! Не магу, прабач мне! Як жа мне з табой застацца — мама будзе хвалявáцца! Ты мне лéпей дагадзі́ — да сцяжынкі давядзі!

Зай Алесіка паслухаў і паты́ліцу пачу́хаў. Потым кажа:



Правообладатель Национальный институт образования

— Эх, Алесік! Шмат сцяжынак тут, у лесе! І якая з іх твая — хіба па́мятаю я! Ты б на дрэва лепш узлез — з дрэва лепей ба́чны лес...

Глядзь Алесік на асінку — надта ж тонкія галінкі! Дый калючыя яны... Лепш пада́цца да сасны! Падбягае... а сасна — вельмі ж гладкая яна! І высокая, да неба...

Ды кудысьці ж лезці трэба!

Тут Вавёрка на ялінцы — скок па тоненькай галінцы. Кажа:

— Я дапамагу! Як змагу і чым змагу! У бядзе я вас не кіну, забяруся на яліну, пагляджу́ ва ўсе бакі́. Вы ж чакайце, дружбакі́!





Правообладатель Национальный институт образования

І, закончыўшы гаворку, паскака́ла ўверх Вавёрка. Скок з галінкі на галінку — вось ужо і верхаві́нка. А з яе ўсе бачны сцежкі, і вядуць яны на ўзме́жкі. І Алесева сцяжынка добра ба́чна з верхавінкі.

Шлях Вавёрка адшукала, хлапчука не ашука́ла. Паказала накіру́нак — атрымала падарунак — велічэзны баравік, а з ім разам махавік і чатыры сыраежкі. А Алесь пайшоў да сцежкі.

Заяц побач з ім скакаў, кошык несці памагаў. Па дуброве, пералеску, дабрылі́ яны да ўзлеска. Тут, на ўзлеску, Зай застаўся і з Алесем развітаўся. І сказаў:



— Бывай, Алесік! Ты да нас прыходзь ізноў. Вельмі добра, што і ў лесе ты знайшоў сабе сяброў!

Зай пабег назад, вядома, а Алесь пайшоў дадому. Ну а дома па



Правообладатель Национальный институт образования

сакрэце расказаў мне казку гэту. Я ж паслухаў, запісаў, вам нічога не казаў. А калі вы што прызналі — значыць, самі прачыталі!

1. Як Алесік апынуўся ў лесе? Што з ім здарылася?
2. Што прапанаваў Алесіку Зайчык? Прачытайце.
3. Чаму Алесік не згадзіўся на прапанову Зайчыка?
4. Якія радкі казкі гавораць пра тое, што хлопчык вельмі любіць сваю маму?
5. Хто з герояў твора вам спадабаўся? Чаму? Каго з іх вы лічыце ветлівымі? Чаму? Знайдзіце ў казцы словы і выразы ветлівай размовы.
6. Размяркуйце ролі і выразна прачытайце казку па ролях.

Прачытайце і адгадайце загадку.

Да вясны жыхар лясны
Не вылазіць з-пад пярыны,
Усю зімку бачыць сны
Пра салодкія маліны.

*Павел Сушко.*






Правообладатель Национальный институт образования

Уту́льна — *рус.*: уютно.

Разгледзьце малюнкі. Як мядзведзь уладкаваўся на зіму? Прачытайце верш.

## Мядзведзь

*Янка Журба*

Прыйшла з вятрамі восень,
шуміць высокі лес.
Пайшоў мядзведзь па лесе,
далёка ў глуш залез.
Пад елкай вырыў яму,
паслаў у ёй галлё —
і ўжо гатова ў мішкі
зімовае жыллё.





Правообладатель Национальный институт образования

А каб мароз траскучы
не ўлез к яму зімой,
наклаў галля над новай
бярлогаю сваёй.
Вось мішка ўжо ў бярлозе,
уту́льна тут яму.
Паправіў ён галінкі,
залёг на ўсю зіму.
Прыйшла зіма з марозам,
заснуў і лес, і бор.
Завеі заспявалі
на ўвесь лясны прастор.
А мішка і не дба́е.
Яго спакойны сон.
Ён спіць на мяккім вецці
аж да вясенніх дзён.





Правообладатель Национальный институт образования

1. У якія поры года адбываюцца падзеі ў вершы?
2. Як мядзведзь рыхтаваўся да зімы?
3. Чаму ў мішкі спакойны сон?
4. Пра што гаворыцца ў першай частцы верша? У другой частцы?
5. Як зразумець выразы: «завеі заспявалі...», «заснуў і лес, і бор»?
6. Навучыцеся чытаць верш выразна.

Як рыхтуецца да зімы вавёрка? Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце і раскажыце казку «Сапраўдныя сябры».





Правообладатель Национальный институт образования

## СЛУХАЙ РОДНУЮ ПРЫРОДУ — ТЫ ПАЧУЕШ ГАЛАСЫ ТАЯМНІЧАЕ КРАСЫ *(Васіль Жуковіч)*



Васілінка ўбачыла, што Лянок сядзіць у задуменні, і захацела яго развесяліць. Але як толькі яна падняла рукі, каб закрыць яму вочы, Лянок сказаў:

— Не перашкаджай! Я слухаю!

— Ха, што ты там слухаеш? Хіба можна што-небудзь зразумець у гэтым шчабятанні? — усміхнулася Васілінка. — Можа, ты будзеш перакладчыкам з птушынай мовы?



Дзе і калі даводзілася вам слухаць птушыныя спевы? Галасы якіх птушак вы чулі? Паслухайце верш і скажыце, як «размаўляюць» птушкі.



Правообладатель Национальный институт образования

# Птушыная мова

*Васіль Жуковіч*



Галубок бурку́е,
зязюля кукуе,
сарока стракоча,
а бацян клякоча.

Усе птушкі мову маюць,
мовай роднай размаўляюць,
мілагучнаю, сваёй, —
гэтак, як і мы з табой.



Це́нькае сінічка:
«Дзе мая сястрычка?»
Цёхкае салоўка:
«Дзе мая сяброўка?»

Ластаўка шчабеча:
«Дзе мая малеча?»
Кукуе зязюлька:
«Дзе мая матулька?»



Усе птушкі мову маюць,
мовай роднай размаўляюць,
мілагучнаю, сваёй, —
гэтак, як і мы з табой.





Правообладатель Национальный институт образования

1. Пра якіх птушак гаворыцца ў вершы? Прачытайце, як яны «размаўляюць».
2. Знайдзіце ў вершы радкі, якія паўтараюцца. З якой інтанацыяй іх трэба чытаць? Чаму?
3. Навучыцеся выразна чытаць верш.

Разважа́ла — *рус.*: рассуждала.

Прачытайце загаловак твора. Аб чым, на вашу думку, пойдзе гаворка ў творы? Прачытайце пачатак тэксту. Адкажыце на пытанне дзяўчынкі, гледзячы на малюнак.

## Званочкі на рабіне

*Фама Рамашка*

Ля дзя-ду-ле-вай хаты стаіць рабіна. Яна ўся засне́жаная. Там-сям на галінках чырванню свецяцца гронкі ягад. «Шкада толькі, што яны нясмачныя. І дзеля чаго такое дрэва расце?!» — разважала Любачка.

Аднойчы з рабіны данёсся меладычны спеў. Нібы сотні званочкаў зазванілі. Здзі-ві́-ла-ся Любачка і тут жа ўбачыла, як чубатыя птушкі ла́суюцца ягадамі. Доўга


Правообладатель Национальный институт образования

стаяла Любачка і слухала перазвон званочкаў.

— Ну вось, бачыш, і спа-трэ-бі-лі-ся горкія ягады, — сказаў дзядуля. — І пакуль ёсць ягады, будзеш ты слухаць спеў чубатых амялу́шак.

«Значыць, патрэбнае дрэва расце ля дзядулевай хаты», — падумала Любачка.



1. Пра што разважала Любачка?
2. Чый меладычны спеў пачула дзяўчынка? На што ён быў падобны?
3. Для чаго спатрэбіліся горкія ягады? Які вывад зрабіла дзяўчынка? Прачытайце.
4. Падзяліце тэкст на тры часткі. Пра што гаворыцца ў кожнай частцы? Перакажыце.

Чаму трэба садзіць дрэвы? Прыдумайце сюжэт для рэкламнага роліка пра неабходнасць садзіць дрэвы.



Правообладатель Национальный институт образования

## МАГУТНЫ СІМВАЛ БЕЛАРУСІ

— Лянок, які лес нашай Беларусі самы знакаміты? — Васілінка разгадвала крыжаванку.

— Гэта Белавежская пушча, — адказаў Лянок. — Так?

— Так, — пацвердзіла Васілінка. — А ты быў у Белавежскай пушчы?

— Мы ездзілі туды на экскурсію, — адказаў Лянок. — Якіх цікавых жывёл і раслін мы там убачылі! Але больш за ўсё мяне ўразіў адзін звер.

А вы здагадаліся, што гэта за звер?

Прачытайце загадку. Правільна вымаўляйце гукі [дз’], [ч], [ц’], [г]. Дадайце адгадку.



Ходзяць волаты ў бары.
Тут жывуць з сівой пары.
Пушчаў то гаспадары,
Знакамітыя ... .

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

**Во́лат** — асілак, велікан.
**Пра́гна** (углядацца) — напружана.
**Гушча́р** — непраходны густы лес.
**Ка́рак** — шыя.

Прачытайце назву тэксту. Разгледзьце малюнак. Пра якіх гаспадароў пойдзе размова?

## Гаспадар пушчы

*Віталь Вольскі*

Трашчы́ць галлё. З шумам і фырканнем пра-дзі-ра-е-цца з не-пра-хо-дна-га гушчару нешта вялікае і ду́жае. Хі-ста́-ю-цца маладыя бярозы. Пад напорам цяжкага цела ні́кне да зямлі густы падлесак.

Гэта — зубр. Вось ён выходзіць на лясную паляну, схіліўшы магутную галаву, і спыняецца, а-све-тле-ны сонцам.

Пра́гна ўглядваюся я ў ляснога волата. Не часта даводзіцца бачыць такое ві-до-вішча.

Увесь ён аброс густой кучаравай шэрсцю цёмна-каштанавага колеру. Яго вялікая, нізка паса́джаная галава з чорнай барадой



Правообладатель Национальный институт образования

і шырокія мускулі́стыя грудзі здзіўляюць сваёй веліччу і магутнасцю. Высокі ка́рак гарбом узвышаецца над спі́наю.

Шыя, грудзі і добрая палова спіны густа пакрыты цёмнай калматай грывай. Шматка́мі ўскудла́чанага ля́мцу звісае гэта грыва над шырока пастаўленымі, тоўстымі і кароткімі нагамі.

Пярэдняя частка яго моцнага тулава, цяжкая і масіўная, здаецца непаме́рна разві́тай у параўнанні з задняй, пакрытай карацейшымі і святлейшымі валасамі. Заднія ногі выглядаюць вышэйшымі і танчэйшымі за пярэднія. Хвост — як у звычайнага быка, але кароткі і тоўсты.

У ясным і ціхім лясным паветры выразна чуецца роўнае і глыбокае дыханне вялікай жывёлы.

Пастая́ўшы крыху́ на месцы, нібы ў задуменні, зубр рушыць далей, абрываючы мімаходам маладыя галінкі ясеня.

Следам за ім выходзіць на паляну ўвесь статак. Тут і маладыя зубры, і падлеткі, і дарослыя зубрыцы з цялятамі, падобнымі



Правообладатель Национальный институт образования

на буйны́х, калматых медзведзянят.

Міну́ўшы лясную паляну, зубр выходзіць на дарогу, спыняецца зноў і, пастаяўшы крыху, нібы разважа́ючы, ідзе па дарозе. За ім паслухмя́на цягнуцца



астатнія. Яшчэ хвіліна — і ўсе зубры: малыя і дарослыя — зніка́юць за высокімі дрэвамі на пavароце, узнімаючы клубы пылу і нага́дваючы здалёку невялікі статак звычайных кароў.

1. Прачытайце, як зубр выходзіў на лясную паляну.
2. Як выглядае зубр? Прачытайце.
3. Чаму аўтар называе зубра лясным волатам?
4. Прачытайце твор правільна і выразна.

Хто з вас бачыў зубра і дзе? Раскажыце, якім вы ўбачылі волата. Чым з’яўляецца зубр для нашай краіны?



Правообладатель Национальный институт образования

## ЯК ЛЯСНЫЯ ЖЫХАРЫ БУДУЦЬ ЖЫЦЬ ЗІМОЮ?
*(Ніна Галіноўская)*

Прачытайце скорагаворку. Выразна вымаўляйце гукі [ ц’], [р], [дз’].

Раніцою золкай
Цецярук з цяцёркай
Прывялі ў дзіцячы сад
Чатырох цецeранят.
*Міхась Пазнякоў.*

Зухава́ты — гарэзлівы; *рус.*: озорной.
Шыпшы́на — *рус.*: шиповник.

Як зімуе цецярук? Паслухайце верш. Якія звяры «паведамляюць» у ім пра падрыхтоўку да зімы?

### У лесе

*Антон Бялевіч*

У ваверкі зухава́тай
Запыта́ўся ў лесе я:
— Дзе, ваверка, твая хата?
— У яліне дуплаватай
Хата цёплая мая.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ты не жа́ла, не касіла,
А ўжо скора лістапад.
— Я ж арэхаў нанасіла.
Я грыбоў сабрала шмат!
— Вожык, дзе твая хаці́на?
Дзе прыту́лішся ў мароз?
Ён, калючы, як шыпшы́на,
На іголках лісце нёс.
— Хатка-норка пад хваінай,
Там радзіўся, там узрос.
— А што будзеш есці, вожык?
У адказ зачмы́хаў ён:
— Лягу спаць я ў цёплы ложак —
Буду спаць да вясніх дзён!
— Цацярук, а ты ў марозы
Дзе прытуліш галаву?





Правообладатель Национальный институт образования

— Змерзну — бу́хнуся з бярозы
У снег. Пад снегам пражыву́!
— А што есці?
— Дасць але́шнік
Пірагоў-пупы́шак мне.
І бярэзнік дасць, канешне,
Хлеба ў роднай старане!

1. Што паведаміла пра свае запасы вавёрка?
2. Навошта вожык нёс на іголках лісце?
3. Чаму пупышкі алешніка цецярук назваў пірагамі? Што яшчэ ён расказаў пра сваё жыццё?
4. Як вы разумееце сэнс апошняга сказа?
5. Размяркуйце ролі і прачытайце верш па ролях.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

**1.** Прачытайце ўрыўкі з твораў. Успомніце іх назвы і прозвішчы аўтараў гэтых твораў. Чым вам запомніліся персанажы з гэтых твораў?

а) «І, закончыўшы гаворку, паскакала ўверх Вавёрка. Скок з галінкі на галінку — вось ужо і верхавінка. А з яе ўсе бачны



Правообладатель Национальный институт образования

сцежкі, і вядуць яны на ўзмежкі. І Алесева сцяжынка добра бачна з верхавінкі».

б) «Праз нейкі час чую: справа арэх шчоўкнуў. Значыць, усё ж Кастусь не ўтрымаўся, каб не паспытаць».

в) «Прыйшла з вятрамі восень,
шуміць высокі лес.
Пайшоў мядзведзь па лесе,
далёка ў глуш залез».

**2.** Разгледзьце фотаздымкі жывёл. Уявіце сябе фатографам і апішыце словамі, якія фотаздымкі лясных звяроў вы зрабілі б для часопіса «Жывая кніга беларускай прыроды». Прачытайце ўрыўкі з твораў раздзела, у якіх расказваецца пра гэтых жывёл.





Правообладатель Национальный институт образования

3. Адгадайце загадкі-падманкі.

а) Між карчакоў размесціць дом
Шар калючы — добры ... слон?

б) Хто любіць па дрэвах насіцца?
Вядома, рудая ... лісіца?

в) Ква ды ква, не песня — цуды!
Слухай ноччу перагуды!
Што быць можа весялей?
Нам спявае ... салавей?

*Генадзь Аўласенка.*







Знайдзіце і зачытайце ўрыўкі з твораў, у якіх узгадваюцца гэтыя жывёлы.



Правообладатель Национальный институт образования

**Ой, зіма, ты — чараўніца,**
**Колькі радасці нясеш!**
*Яніна Жабко.*



# КОЛЕРЫ ГОДА. ЗІМА

У снежні сняжынкі
занеслі сцяжынкі.

Ходзіць студзень,
Студзіць студзень,
Цэлы месяц холад будзе.
*Авяр'ян Дзеружынскі.*

Надзьмуты люты дзьме.
Ну, дзе канец зіме?
*Васіль Жуковіч.*

Правообладатель Национальный институт образования

## КРУЖАЦЦА, КРУЖАЦЦА ЗОРКІ-СНЯЖЫНКІ І ЗІХАЦЯЦЬ ТАЯМНІЧЫМ СВЯТЛОМ...

*(Яніна Жабко)*

Успомніце, якія пачуцці (радасць, здзіўленне, пяшчота) узнікаюць у вас, калі любуецеся першым снегам.

Угары́ — уверсе; *рус*.: вверху.

Разгледзьце малюнак. Прачытайце назву верша. Уявіце, якая размова магла адбыцца паміж сняжынкамі.

### Размова сняжынак

*Ніна Галіноўская*



Мы — вясёлыя пушынкі,
І сябруем мы з зімой,
Мы — сняжынкі-балерынкі,
Мы танцуем танец свой.



Правообладатель Национальный институт образования



Ах, як хочацца нам болей
Пакружыцца над зямлёй!
Апускаемся паволі
І гамонім між сабой:
— Я саджуся на галінку.
— Я — на плот.
— А я — на дах.
— Апушчуся на сцяжынку.
— Сяду я на правадах.
Мы — вясёлыя пушынкі,
Мы танцуем угары,
Мы — сняжынкі-балерынкі.
Танец наш — для вас, сябры!

1. Прачытайце, што паведамілі пра сябе сняжынкі. Пры чытанні голасам выдзяляйце словы кожнай сняжынкі.
2. Для каго паказваюць свой танец сняжынкі?
3. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб паказаць танец сняжынак?
4. Навучыцеся чытаць верш выразна.

Якi зімовы пейзаж вы ўявілі? Апішыце яго словамі. Па жаданні стварыце малюнкі.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце прыказку. Якую карысць нясе снег?

- Многа снегу — многа хлеба.

**Гары́шча** — памяшканне паміж столлю і дахам на хаце; *рус.*: чердак.

Прачытайце твор і скажыце, чаму аўтар называе снег цёплай коўдрай.

## Снег

*Васіль Хомчанка*

Зямля доўга ляжала голая, скамяне́лая ад марозу. А потым адной ноччу пайшоў снег і ўкрыў усё белай цёплай коўдрай.





Правообладатель Национальный институт образования

Ромка дастаў з гарышча лыжы і памчаўся ў поле. Раздолле для хлопца!

Ромкаў бацька таксама радуецца. Маладыя яблынькі ў садзе цяпер не за-ме́рзнуць. Карані́ іх добра ўкрыты снегам.

І мядзведзю ў бярлозе цяплей стала. Вожыку — у кучы лісця, мышцы — у нары.

Усім цёпла, усе радуюцца.

Толькі беднаму зайку слёзы. Да зімы не паспеў шэрую поўсць змяніць на белую.

1. Знайдзіце ў творы і прачытайце, каго парадаваў першы снег.
2. Якія «добрыя справы» робіць снег?
3. Як вы разумееце выраз «толькі беднаму зайку слёзы»?
4. Падрыхтуйце пераказ твора.



Прачытайце народныя прыкметы пра зіму. Паназірайце за зімовымі з'явамі ў прыродзе.

- Калі мала снегу на галінках дрэў, то летам ні грыбоў, ні ягад не знойдзеш.
- На дубе многа жалудоў — будзе марозная зіма.



Правообладатель Национальный институт образования

## КАБ НЕ ГАЛАДАЛІ ПТУШКІ, БУДЗЕМ ІМ РАБІЦЬ КАРМУШКІ *(Міхась Пазнякоў)*



— Бачыш, Васілінка, колькі кармушак для птушак змайстравалі дзеці! — сказаў Лянок.

— Гэта вельмі добра. Але чамусьці ў кармушку яны часам забываюцца насыпаць корм для птушак. Кармушкі не парадуюць птушак, калі яны пустыя...

Раскажыце, як вы клапоціцеся пра птушак зімой.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

○ **Пакармі птушак зімой, яны аддзячаць табе вясной.**

Прачытайце назву апавядання. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім гаворка?

## Чырвоныя гронкі рабіны

*Рыгор Ігнаценка*

На бярозе каля школы вісіць кармушка. Разам з настаўніцай вучні назіраюць, як жаўтагрудыя сініцы з вераб'ямі дзяўбуць хлебныя крошкі.

— Ганна Паўлаўна, — пытае Лёня, — чаму снегіроў няма?

Настаўніца адказала:

— Яны хлеба не ядуць. Снегіры любяць ягады: бузіну́, рабі́ну, крушы́ну.

Рабіну! Тут толькі Лёня ўспомніў пра ягады, якія яны схавалі са Сцёпам.

Пагодлівым асеннім ранкам хлопчыкі гулялі па лесе. На светлай прагалінцы нарвалі рабіны. Па-ка-шта-ва́-лі, а яна горкая,



Правообладатель Национальный институт образования



у рот не ўзяць. Хлопчыкі сха-ва-лі ягады пад дрэвам, накрылі зялёным мохам, спадзе-ю-чы́-ся забраць зімой, калі яны пе-раме́р-знуць.

У той жа дзень пасля заняткаў сябрукі на лыжах паехалі ў лес. Яны адшукалі дрэва, пад якім былі схаваны ягады рабіны, і пачалі капаць снег.

— Ура! Цэлая! — усклікнуў Лёня і пакаштаваў. Ягады былі смачныя, салодкія. Хлопчыкі забралі іх і памчаліся дахаты. Дома павяза́лі рабіну ў невялікія пучкі і павесілі на гарышчы. А некалькі чырвоных гронак зане́слі на кармушку.

Назаўтра Лёня са Сцёпам першыя прыбеглі ў школу. Глядзяць — снегіры на кармушцы. Сядзяць і пава́жна дзяўбуць ягады рабіны.



Правообладатель Национальный институт образования

Падыходзілі вучні і з цікавасцю глядзелі на чы-рва-на-гру́-дых гасцей.

Са школы выйшла настаўніца.

— Ганна Паўлаўна, снегіры! — закрычалі дзеці.

— Хочаце іх кожную зіму бачыць? — спытала настаўніца.

— Хочам.

— Тады давайце вясной шмат сваіх рабінак пасадзім каля школы.

1. Чаму снегіры не прыляталі на кармушку?
2. Раскажыце, як Лёня і Сцёпа адшукалі ягады рабіны.
3. Як аўтар перадае радасць хлопчыкаў ад зробленай добрай справы?
4. Што трэба зрабіць, каб бачыць снегіроў кожную зіму?
5. Падзяліце тэкст на часткі па плане. Перакажыце твор.

П л а н

1. Чаму на кармушцы няма снегіроў?
2. Дзе схаваны ягады рабіны?
3. Снегіры на кармушцы!
4. Хочаце кожную зіму бачыць снегіроў?



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце апошнюю частку апавядання. Складзіце працяг твора пра тое, як вучні пасадзілі маладыя рабінкі. Хто ім дапамагаў? Што адбылося праз некалькі гадоў?

Разгледзьце малюнак. Што здарылася? Як вы думаеце чаму? Паслухайце апавяданне.



## Галка

*Васіль Хомчанка*

У агародчыку зляпіў я Дзеда Мароза са снегу. Дзе вочы — чорныя вугольчыкі ўторкнуў. А нос зрабіў з вялікай жоўтай морквы.

У рукі Дзеду Марозу даў скры́начку і насы́паў туды зярнят.

— Часту́й птушак, — сказаў я яму, а сам зайшоў у хату і стаў каля акна.

Прыляцела першая сінічка. Пі́скнула, села на край скрыначкі, дзеўбану́ла раз, другі. Потым снягір апусціўся побач. А нахабны верабей залез у кармушку з нагамі.

Чорная галка з бярозы таксама заўважыла кармушку. Пераляцела на самую ніжнюю



Правообладатель Национальный институт образования

галінку, але спусціцца на кармушку не адва́жылася. Пакуль галка сядзела так ды а-гля́-два-ла-ся, птушкі ўсё па-дзяў-блі і ра-зля-це-лі-ся.



Галка скокнула ў кармушку, а ў кармушцы пуста. Яна са злосці схапіла дзюбай моркву і паляцела з ёю.

І Дзед Мароз застаўся без носа.

1. Прачытайце, як выглядаў Дзед Мароз. Якую важную справу ён «выконваў»?
2. Якія птушкі прыляталі на кармушку? Прачытайце, як яны сябе паводзілі.
3. Чаму галцы засталася толькі морква? Знайдзіце і прачытайце радкі твора, якімі можна падпісаць ілюстрацыю.
4. Чаму аўтара, які паведаміў гэту гісторыю, можна назваць клапатлівым чалавекам?
5. Навучыцеся выразна чытаць апавяданне.



Правообладатель Национальный институт образования

## САМЫ СВЕТЛЫ ТАЛЕНТ — ДАБРАТА
*(Сяргей Грахоўскі)*



— Лянок, мы ўчора хадзілі на каток, — расказвала Васілінка. — Адна маленькая дзяўчынка часта падала: яна яшчэ не навучылася добра стаяць на каньках.

— А ўсе смяяліся, — з дакорам перапыніў Васілінку Лянок.

— Не, старэйшая дзяўчынка ўзяла яе за руку, і яны пачалі катацца разам.

А як бы вы паступілі ў такой сітуацыі?



Правообладатель Национальный институт образования

**Нараві́стая** — *тут*: гара, якая патрабуе ад дзяцей спрыту, смеласці ў час спуску з яе.
**Нато́ўп дзетвары́** — шмат дзяцей.

Разгледзьце малюнак на с. 94. Паслухайце верш. Хто з герояў верша выклікае спачуванне?

## З гары

*Васіль Жуковіч*

Як садзіўся ехаць Санька
ля натоўпу дзетвары́,
не́як вы́слізнулі санкі
і памчаліся з гары.

Доўга чуўся дружны смех,
што не ехаў Санька — бег.

Потым выйшла так, што Санька
сам паехаў па лядку́.
На гары ляжалі санкі,
спачывалі на баку.

Зноў усім была пацеха,
што на футры Санька з’ехаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Ды знайшоўся камандзір —
добры сябра Федзя, —
узяў малога «на буксі́р»
і сказаў:
— Паедзем!

Шпарка ехалі сябры
з наравістае гары.

1. Чаму дзеці смяяліся з Санькі? Ці можна назваць іх добрымі сябрамі?
2. Хто дапамог Саньку? Чаму? Падмацуйце свой адказ радкамі з верша.
3. Чаму аўтар называе Федзю камандзірам?
4. Ці хацелі б вы пасябраваць з Федзем? Якія рысы характару гэтага хлопчыка вам спадабаліся? Каго можна назваць сапраўднымі сябрамі?
5. З якімі пачуццямі трэба чытаць апошнія радкі верша? Навучыцеся выразна чытаць верш.
6. Як вы разумееце сэнс прыказкі: «Чалавек без сябра, што дрэва без карэння»? Ці падыходзіць яна да зместу верша? Растлумачце вашу думку.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце і адгадайце акразагадку. Выразна вымаўляйце галосныя.

**З**ямлю снегам замяла
**А**д сяла і да сяла.
**В**ецер гу́рбы абдымаў
**І** да неба падымаў.
**Р**а́нкам глянулі ў акно:
**У**х! Ад снегу ледзь відно.
**Х**тосьці мёў, і хтосьці выў.
**А**дгадайце, хто ж там быў?

*Уладзімір Мацвеенка.*

Небара́ка — *рус.*: бедняга.
На прыдво́рку — *рус.*: во дворе.

Прачытайце назву апавядання, разгледзьце малюнак. Падумайце, пра што можа ісці размова ў творы.

## Пагрэйся, ветрык!

*Фама Рамашка*

Ася намалявала прыгожага матылька. Устала з-за стала і падышла да акна: «Чым жа цяпер заняцца?»



Правообладатель Национальный институт образования

На прыдворку блішчалі замерзлыя лужыны, крыху пры-ця-ру́-ша-ны-я снегам. Нечакана шыбы ў акне за-трым-це́-лі. Затым нібы хтосьці пасту́каў, пачуўся свіст. Дзяўчынка нават спа-ло-ха-ла-ся.

«Ды гэта ж вецер, — нарэшце здагада́лася Ася. — Замёрз, небарака. Просіцца ў дом, пагрэцца хоча».

«Што ж рабіць?» Адчыніла акно. Паве́яла халодным ветрыкам. Гардзі́на прыўзнялася і павісла на карнізе. У пакоі закружыліся газеты, за-шар-па-це́-лі старонкі та́тавай кніжкі.

— Вецер, не дурэй! Я ж пусціла цябе пагрэцца.





Правообладатель Национальный институт образования

Але вецер не слухаўся дзяўчынку. Стала зусім холадна.

— Ну, калі ты такі не-па-слу-хмя-ны, уцякай прэч! — пакрыўдзілася Ася і адчыніла дзверы.

Яшчэ больш засваволіў вецер.

— Не слухаешся, не пушчу болей, — дакарала Ася вецер.

Хуценька зачыніла дзверы, а пасля — акно. Навяла парадак у пакоі.

Толькі свой малюнак не знайшла. Вецер, напэўна, узяў з сабою: спадабалася яму, як Ася малюе.

1. Хто з герояў твора вам спадабаўся? Чым?
2. Прачытайце, як Ася пачула свіст ветру. Пра што падумала дзяўчынка?
3. Чаму Ася вырашыла пусціць вецер у дом? Ці можна назваць яе клапатлівай, спагадлівай дзяўчынкай? Чаму?
4. За што пакрыўдзілася Ася на вецер?

Пафантазіруйце, куды знік малюнак Асі. Для чаго ён спатрэбіўся ветру? Калі яго зноў магла ўбачыць дзяўчынка?



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАЦАВІТАМУ ЧАЛАВЕКУ І МАРОЗ НЕ СТРАШНЫ

Адгадайце народную загадку.

- Кусаецца, а не воўк, малюе,
  а не мастак, пячэ, а не агонь.

Ко́мін — *рус.*: печная труба.

Прачытайце казку. Чаму мароз не здолеў замарозіць селяніна?

### Два маразы

*Беларуская народная казка*

Гулялі па полі два маразы, два родныя браты: Мароз Сіні Нос і Мароз Чырвоны Нос.

Гуляюць-па-гу́ль-ва-юць маразы, адзін аднаго па-хва́ль-ва-ю-чы. А ноч ясная-ясная. Прасторна маразам на волі. А ціха, так ціха, нібы жывой душы не засталося на свеце. Перабеглі маразы з поля на лес. Бегаюць, па-лу́-сква-юць, з дрэва на дрэва пе-ра-ско-ква-юць, зайчыкаў палохаюць. З лесу ў вёску заскочылі і давай па да́ху страляць.



Правообладатель Национальный институт образования

— Эге, — кажа Мароз Сіні Нос, — усе пахава́ліся, баяцца на двор вы́лезці.

— Няхай толькі вылезе хто: задамо яму страху, — адказвае Мароз Чырвоны Нос.

Пачало ра-зві-дня-цца. Паваліў з комінаў дым густы. Заскрыпелі калодзежы. Павыходзілі мужчыны з хат. Хто малаціць пайшоў, хто ў лес па дровы збіраецца.

— Стой жа, брат, — сказаў Мароз Чырвоны Нос. — Пабяжым жа мы на дарогу ў поле.

І пабеглі яны зноў у поле; стаяць, прытулі́ўшыся, падарожных чака́юць.

Заскрыпе́лі сані на дарозе. Зазваніў дзесь званочак пад дугою.





Правообладатель Национальный институт образования

У санях селянін сядзіць, коніка паганяе. А ззаду за ім зу-хаў-скі́ вазок плыве. Званочак пазвоньвае.

— Ну, чакайце ж вы, — кажа Мароз Сіні Нос. — Ты бяжы за мужыком, а я за панам паганюся.

І пабеглі яны падарожных марозіць. Доўга бег Мароз Сіні Нос, пакуль пана дагнаў. Нарэшце дагнаў, пад футра залез, цяпло выганяе адтуль. Паціска́ецца пан, ногі зябнуць, холад па целе пайшоў, панскі нос пасінеў. А Мароз Сіні Нос толькі пасме́йваецца. Ледзь да смерці пана не замарозіў.





Правообладатель Национальный институт образования

А Мароз Чырвоны Нос дагнаў селяніна і давай яго марозіць.

— Эге, мароз не жартуе, — кажа селянін. Злез ён з саней, бяжыць, нагамі ту́пае, рукамі аб плечы б’е. Прабег так з паўвярсты, аж горача стала яму. Сеў сабе на сані, едзе — і гора мала.

— Ну, пачакай ты, брат: прайму я цябе, як ты дровы сячы́ будзеш.

Заехаў чалавек у лес. А Мароз Чырвоны Нос вы́-пе-ра-дзіў яго, у лесе чакае. Выпраг коніка селянін, сякеру ўзяў ды як пачаў се́кчы — горача стала яму. Скінуў кажух. А Мароз і ўзрадаваўся: залез у кажух і давай там белыя кросны ткаць.

Зрабіўся кажух белы, як снег. Насек дроў чалавек, да кажуха ідзе, а ён увесь абмёрз.

— Эге, браток, дык ты тут!

Узяў пугаўё ды як стаў малаціць — ледзь жывы вы́скачыў Мароз Чырвоны Нос ды дра́ла ў лес.

Узлаваўся Мароз Чырвоны Нос на селяніна, але ніякай рады даць яму не можа.

*Апрацоўка Якуба Коласа.*



Правообладатель Национальный институт образования

1. Якімі вам уяўляюцца Мароз Сіні Нос і Мароз Чырвоны Нос?
2. Што вырашылі зрабіць маразы?
3. Раскажыце, як Мароз Сіні Нос ледзь не замарозіў пана. Чаму так адбылося?
4. Прачытайце, як Мароз Чырвоны Нос спрабаваў сваю сілу на працавітым селяніне. Чаму ён не здолеў замарозіць яго?
5. Знайдзіце і прачытайце ў казцы прыкметы марознага надвор'я. Калі кажуць, што мароз па даху страляе?
6. Растлумачце сэнс сказа: «А Мароз і ўзрадаваўся: залез у кажух і давай там белыя кросны ткаць».

Раней на Беларусі тканіну ткалі на спецыяльным станку — кроснах.





Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце малюнак. Складзіце па ім апавяданне «Як праца дапамагае ад марозу ўцячы». Словы і выразы для выкарыстання: пасля снегападу; марозны дзень; чысціць дарожкі; карысная праца; маленькія памочнікі; дружная праца дзяцей і дарослых.



Прачытайце скорагаворку. Правільна вымаўляйце словы з гукам [р].

Працаваць я вельмі рад —
Не ідзе адклад на лад.

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРЫХОДЗІЦЬ НОВЫ ГОД, МЫ ДЗВЕРЫ АДЧЫНЯЕМ З НАДЗЕЯЙ, КАБ УСІМ ШЧАСЛІВЫМІ НАМ БЫЦЬ *(Яніна Жабко)*



— Я так люблю навагоднія святы! А ты, Лянок? — пацікавілася Васілінка.

— І я таксама. Асабліва люблю, калі мы ўсёй сям'ёй рыхтуемся да свята. Але вось пакуль не ведаю, якія падарункі зрабіць сваім родным...

Раскажыце, як у вашай сям'і сустракаюць Новы год. Хто і для каго рыхтуе падарункі?

Карагóд — *рус.*: хоровод.



Правообладатель Национальный институт образования

Паслухайце верш. Якім настроем ён напоўнены?

## Новы год

*Уладзімір Мазго*

Новы год, Новы год!
Белы снег, як вата.
Каля ёлкі карагод
Закружыла свята.

Скачуць заяц і ліса —
Добрыя суседзі.
Па палях і па лясах
Дзед Мароз зноў едзе.

А гірлянды і шары
Ззяюць на галінках,
Бо прыйшла да дзетвары
Лепшая ялінка.

Паскара́юць стрэлкі ход,
Нібы ў эстафе́це,
Каб сустрэлі Новы год
Каля ёлкі дзеці.



Правообладатель Национальный институт образования

Хай і людзі, і звяры
Век жывуць у згодзе,
Хай жадаюць нам сябры
Шчасця ў новым годзе!

1. Якому святу прысвечаны верш?
2. З чым параўноўваецца ў вершы снег? Чаму?
3. Прачытайце, як аўтар апісвае вясёлыя хвіліны навагодняга свята.
4. Знайдзіце і выразна прачытайце радкі, у якіх гучаць добрыя пажаданні.
5. Знайдзіце ў вершы словы, якія рыфмуюцца.
6. Навучыцеся чытаць верш выразна.

Прачытайце пажаданні, якія здаўна жывуць у народзе: *Жадаю вам шчасця! Каб вы былі здаровыя і радаваліся! Расці дужы ды вялікі!* Складзіце «чароўны мяшэчак» навагодніх пажаданняў.

Гарэ́зны — *рус.*: озорной.

Прачытайце назву верша. Пра што ў ім пойдзе гаворка?



Правообладатель Национальный институт образования

## Мех, снег і смех

*Таццяна Мушынская*

Дзед Мароз нёс свой мех
Ды паставіў мех у снег.
Снег ішоў, ішоў, ішоў…
Дзед свой мех і не знайшоў.

Развязалі птушкі мех,
Там знайшлі гарэзны смех.
Калыханкі і лічылкі,
Забаўлянкі і дражнілкі,

Казкі, мноства небыліц —
Для братоў і для сястрыц.

Казкі, байкі ўсіх гатункаў
Будуць лепшым падарункам.
Разбярыся: дзе тут мех?
Дзе тут снег? І дзе тут смех?

1. Чаму Дзед Мароз не знайшоў свой мех?
2. Што знайшлі ў мяху птушкі? Хто і як знойдзе добры, вясёлы смех, калі будзе чытаць гэтыя кнігі?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Ці могуць казкі, вершы быць добрым падарункам? Растлумачце сваю думку.
4. Знайдзіце ў вершы словы, якія рыфмуюцца.
5. Навучыцеся выразна чытаць верш.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

**1.** Прачытайце ўрыўкі з твораў. Успомніце назвы твораў і прозвішчы іх аўтараў.

а) — Стой жа, брат, — сказаў Мароз Чырвоны Нос. — Пабяжым жа мы на дарогу ў поле.

б) — Ганна Паўлаўна, снегіры! — закрычалі дзеці.

в) Ды знайшоўся камандзір —
добры сябра Федзя, —
узяў малога «на буксір»
і сказаў:
— Паедзем!

**2.** Уявіце сабе, што вы перапісваецеся з дзецьмі, якія жывуць у краіне, дзе не бывае



Правообладатель Национальный институт образования

халоднай зімы. Яны ніколі не бачылі снегу, не ведаюць, што такое мароз, сцюжа.

Складзіце вусны працяг пісьма:

*Паважаны...*

*У нашай краіне наступіла зіма. Можа, ты не ведаеш, што гэта такое? Я раскажу табе пра...*

**3.** Разгледзьце малюнкі. Да якіх твораў яны зроблены? Прачытайце ўрыўкі з адпаведных твораў.





Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Разгледзьце ілюстрацыю. Складзіце невялікую казку «Прыгоды снегавікоў».





*Выцíнанка* — гэта прыгожы ўзор, выразаны з белай або каляровай паперы. Раней выцінанкі рабілі для ўпрыгожвання дома (іх вешалі на сцены, паліцы, дзверы). У наш час выцінанка выкарыстоўваецца ў афармленні акон, кніг, паштовак.



Правообладатель Национальный институт образования

Ехаў казачнік Бай
Цераз сёлы і гай.
— Баіць ці не?
— Бай!

*Максім Танк.*

# СУСТРЭЧА З КАЗКАЙ



Правообладатель Национальный институт образования

## ЯК НЯХІТРЫ ХІТРАГА ПЕРАХІТРЫЎ




— Лянок! Я чытаю кнігу «Беларускія народныя казкі». А ты любіш чытаць казкі? — запыталася Васілінка.

— Так, люблю, — адказаў Лянок. — Я заўважыў, што паводзіны жывёл не заўсёды адпавядаюць павадкам дзікіх і свойскіх звяроў і птушак.

Ці згодны вы з Лянком?

За-сму-ці́ў-ся — *рус.*: огорчился.
Ра-зя́ў-ле-ны (рот) — адкрыты.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце назву казкі. Што вы ведаеце пра лісу? Пра гусака? Прачытайце казку «Лісіца і Гусак» і раскажыце, што яшчэ вы даведаліся пра іх.

## Лісіца і Гусак

*Беларуская народная казка*

Неяк Лі-сі-ца зла-ві-ла Гусака і кажа: «Гусак, Гусак, я цябе з’ем!» Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, Лі́сачка. Толькі дазволь мне перад смерцю па-тан-ца-ваць».

Ліса а-дка-зва-е: «Танцуй сабе, а з’есці я цябе яшчэ паспею». Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пе-ра-сту-па́ць.



Глядзіць Ліса на Гусака і смяецца: «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»

А Гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу перастпаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася Лісіца з ра-зяў-ле-ным ротам.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму засмуціўся Гусак?
2. Аб чым ён папрасіў Лісу? Прачытайце радкі, якімі можна падпісаць малюнак.
3. Якія якасці характару праявіў Гусак? Выберыце патрэбныя словы: *хітрасць, смеласць, разгубленасць, баязлівасць, разважлівасць*.
4. Прачытайце казку па ролях.

Прачытайце словы: *працавіты, злы, старанны, галодны, разважлівы, смелы*. Якія словы падыходзяць да апісання Вала, Ваўка?

За-ві-ха́-цца — старанна працаваць.
Па-дцяў-шы хвасты́ — падкруціўшы хвасты.

## Хітры Вол

*Беларуская народная казка*

Пайшоў Вол сена касіць. Косіць, завіхаецца, на неба паглядае: ці не відаць адкуль хмары? «За пагоду, — думае, — сена насушу, стог скі́даю, тады і зіма не страшна». Ідзе Воўк. Загле́дзеўся на Вала.

— Ты Бык? — пытаецца.

— Не, я Вол.

— Сена косіш?



Правообладатель Национальный институт образования

— Кашу.
— Рагамі грабеш?
— Грабу.
— Хвастом падграбаеш?
— Падграбаю.
— А мяне ты не баішся?
Падумаў Вол і кажа:
— Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!
Паверыў Воўк і пайшоў шукаць сабе падмогі. Прыходзіць на другі дзень з двума братамі.



— Ты Бык? — зноў пытаецца.
— Не, Вол.
— Сена косіш?
— Кашу.
— Рагамі грабеш?
— Грабу.
— Хвастом падграбаеш?
— Падграбаю.
— І трох нас ты таксама не баішся?
Што Валу рабіць? Давай ён далей хітрыць.
— Не толькі трох, — кажа, — а і чатырох не баюся.
Паверылі ваўкі і падалі́ся шукаць новых сяброў.



Правообладатель Национальный институт образования

Доўга шукалі. Нарэшце прыходзяць на балота цэлаю чарадою. Глядзяць, а там ужо стог сена стаіць і Вала не відаць.

Кінуліся ваўкі па следзе і прыбеглі да двара, дзе Вол жыў. Двор Вала высокім частаколам абгароджаны.

Круціліся, круціліся ваўкі, скакалі, скакалі, ды так да Вала і не дабраліся.

— Ага, — закрычалі яны са злосці, — ты, баязлівец, схітрыў!

— Схітрыў ці не схітрыў, — адказвае Вол, — а стог сена за пагодай накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася.

І павалакліся ваўкі прэч, хвасты падцяўшы.

1. Чым быў заняты Вол? Чаму ён спяшаўся?
2. Хто да яго прыйшоў? Які адказ даў Вол Ваўку?
3. Прачытайце, як паводзілі сябе ваўкі каля дома Вала. Што адказаў ім Вол?
4. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання казкі.
5. Прачытайце прымаўку. Каго з герояў прачытаных казак можна назваць смелым?
   - Смеламу перамога ідзе насустрач.



Правообладатель Национальный институт образования

## МАНА НЕ ДАВЯДЗЕ ДА ДАБРА
*(З народнага)*



— Васілінка, мне здаецца, што я трапіў у казку і вакол мяне казачныя героі. Вось гэтыя тры ружовыя парсючкі — Нуф-Нуф, Ніф-Ніф і Наф-Наф з казкі «Пра трох парсючкоў», — сказаў Лянок.

— Ой, праўда! — адгукнулася Васілінка. — А беларускую народную казку пра козачку ты ведаеш?



Правообладатель Национальный институт образования

Маню́ка — той, хто гаворыць няпраўду, падманшчык.
Насвары́цца — *рус.*: поругать.
Пры́зба — земляны насып вакол хаты, каб узімку было цёпла.

Прачытайце назву казкі. За што Казу маглі так назваць? Праслухайце казку і скажыце, хто дапамог Зайчыку.

## Каза-манюка

*Беларуская народная казка*

Жылі дзед ды баба з дачкою. І была ў іх Каза. Па-гнала дачка па́свіць казу. Цэлы дзень па-сві-ла па бары, па ду-браў-цы, па траўцы, па му-раў-цы. У-ве-ча-ры пры-га-ня-е дахаты. Дзед пы-та-е-цца ў Казы:

— Каза мая, Козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Кажа Каза:

— Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, у-ха-пі́-ла кля-но-вы лісток, а як бегла ля кры-ніч-кі, ухапіла кро-пель-ку вадзічкі…



Правообладатель Национальный институт образования

На-сва-рыў-ся дзед на дачку, што дрэнна Казу пасвіла, і назаўтра вы-пра-віў бабу.

Цэлы дзень пасвіла баба Казу па бары, па ду-бра-ў-цы, па траўцы, па му-раў-цы. Увечары прыганяе дахаты. Дзед зноў пытаецца ў Казы:

— Каза мая, Козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

— Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

Дзед і на бабу насварыўся, што дрэнна Казу пасвіла. Надзеў тады дзед бабін капта́н





Правообладатель Национальный институт образования

і хустку ды пайшоў сам пасвіць Казу. Цэлы дзень пасвіў па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы. Увечары вярнуўся дахаты, пе-ра-а-пра-нуў-ся, сеў на прызбе і чакае Казу з пашы.

Прыйшла Каза на двор.

Дзед пытаецца:

— Каза мая, Козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

— Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

У-зла-ваў-ся дзед на Казу-манюку, прывязаў яе за плот, а сам пайшоў касу вастрыць, Казу-манюку рэзаць.



Да-зна́-ла-ся пра гэта Каза, са-рва-ла-ся з прывязі і пабегла ў лес. Знайшла ў лесе зай-чыка-ву хатку, залезла ў яе і жыве там, а Зайчыка і на парог не пускае.

Сеў Зайчык пад елачкай і плача.



Правообладатель Национальный институт образования

Ідзе Воўк:

— Чаго, Зайчык, плачаш? Чаго за-жу-ры́ў-ся?

— Як жа мне не плакаць, як не журыцца? Была ў мяне хатка — новая, яловая. Прыйшоў нейкі звер рагаты ды ба-ра-да-ты, выгнаў мяне з хаты і сам у ёй жыве, а мяне і на парог не пускае.

— Ну добра, не плач, я таго звера выганю.

Па-ды-шоў Воўк да зайчыкавай хаткі, пастукаў хвастом у дзверы і кажа:

— Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай мана́ткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

А Каза як за-ту́-па-е за дзвярыма, як за-мэ-ка-е:

— Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Спужаўся Воўк ды ад бяды ўцёк. А Зайчык зноў сеў і плача. Ідзе Мядзведзь:

— Чаго, Зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

— Як жа не плакаць, як не журыцца?

І расказаў Мядзведзю пра сваю бяду.

— Ну добра, — кажа Мядзведзь, — не плач, я таго звера адразу выганю.



Правообладатель Национальный институт образования

Падышоў ён да зайчыкавай хаткі, патупаў каля дзвярэй ды кажа:

— Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

А Каза як затупае, як замэкае:

— Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Спужаўся і Мядзведзь ды ў гушчар — кульге́ць, кульгець... Ідзе Певень. Убачыў заплаканага Зайчыка і пытаецца:

— Чаго, Зайчык, плачаш? Чаго, брат, зажурыўся?

— Як жа мне не плакаць, як не журыцца?

І расказаў Зайчык пра сваю бяду.

— Э, — кажа Певень, — такую бяду я адной лапай развяду. Я таго звера ведаю — гэта дзедава Каза-манюка...

Падышоў Певень да зайчыкавай хаты, залопаў крыламі, за-ку-ка-рэ-каў:

— Ку-ка-рэ-ку! Кукарэку!

Заб’ю Казу-не-да-рэ-ку!

Пачула Каза ды як затупае, як замэкае:

— Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!



Правообладатель Национальный институт образования



Тады Певень яшчэ мацней залопаў крыламі і закрычаў:

— Гэй, Каза, збірай манаткі,
Уцякай хутчэй ты з хаткі,
Бо вунь дзед ідзе,
Ён касу нясе...

Як пачула Каза пра дзеда з касою, на-пу-жа́-ла-ся і кулём вы-ска-чы-ла з хаткі. А Зайчык з Пеўнікам зайшлі ў хатку і сталі там жыць-пажываць ды дабра нажываць.

1. Як дзед дазнаўся пра падман Казы?
2. Як дзед вырашыў пакараць Казу?
3. Чаму плакаў Зайчык?
4. Хто дапамагаў Зайчыку выгнаць Казу? Прачытайце па ролях.
5. Чаму Пеўніку ўдалося выгнаць Казу?



Прачытайце прыказку. Ці падыходзіць яна да казкі «Каза-манюка»?

- Хто маніць, таму не вераць.



Правообладатель Национальный институт образования

# АДЗІН ДРУГОГА ДАВОДЗІЦЬ ДА ЛІХОГА

*(З народнага)*

Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Маленькі шарык
Пад лаўкай шарыць,
Збірае крошкі,
Баіцца кошкі.

акшым

*Н. Гілевіч.*

2. Ён па лесе скок ды скок,
Косіць вокам з боку ў бок.
У дупле ваверка — шчоўк!
А яму здаецца — воўк.

цяаз

*У. Мацвеенка.*

3. Калі вецер
Дзьме халодны,
Ён блукае
Злы, галодны.

кўов

*З народнага.*

Па-лí-ца — полка ў шафе ці на сцяне.
Сá-жа-лка — невялічкае возера, якое выкапаў чалавек.
Ра-га-тý-ха — тая, якая гучна смяецца.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце назву казкі і два першыя сказы. Што магло здарыцца? Прачытайце казку. Хто выратаваў Муху-пяюху з сябрамі?

## Муха-пяю́ха

*Беларуская народная казка*

Жыла-была Муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць ка-ма-роў. За-прэ-гла Муха-пяюха камароў у каляску ды па-е-ха-ла на па-гу-лян-ку.

Едзе яна дарогаю, едзе шы-ро-ка-ю — бяжыць мышка:

— Добры дзень, пані! Як паню зваць-велічаць?

— Я Муха-пяюха. А ты хто?

— А я Па Па-лі́-цах Скра-ба-ту́-ха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — скача жабка:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.

— Па Паліцах Скрабатуха. А ты хто?

— А я Па Сажалках Ра-га-ту-ха.



Правообладатель Национальный институт образования

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — сядзіць на галінцы ваверка:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.

— Па Паліцах Скрабатуха.

— Па Сажалках Рагатуха. А ты хто?

— А я Па Е́лках Скаку́ха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць заяц:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.

— Па Паліцах Скрабатуха.

— Па Сажалках Рагатуха.

— Па Елках Скакуха. А ты хто?

— А я Праз Дарогу Скок.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — ідзе воўк:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.



Правообладатель Национальный институт образования



— Па Паліцах Скрабатуха.

— Па Сажалках Рагатуха.

— Па Елках Скакуха.

— Праз Дарогу Скок. А ты хто?

— А я Галодны Воўк. Усіх вас паем!..

Пачулі гэта камары, па-дня-лі-ся ўгору і паляцелі разам з каляскай. А Галодны Воўк па-ля́с-каў зубамі і пайшоў далей ні з чым.

1. Як называлі сябе муха, мышка, жабка, ваверка, зайчык і чаму?
2. Прачытайце, хто апошнім сустрэўся сябрам. Якім вы ўяўляеце ваўка?
3. Якую рускую народную казку нагадвае казка «Муха-пяюха»? Чым там скончылася казка?
4. Прачытайце казку па ролях.



Закончыце параўнанні. Чаму так гавораць?

Надакучлівы як … .
Рухавы як … .
Пужлівы як … .
Галодны як … .



Правообладатель Национальный институт образования

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

**1.** Прачытайце загадкі і адгадайце іх. З якіх казак «прыйшлі» гэтыя героі? Якія якасці характару яны праявілі?

Футра рыжае надзела
І ў люстэрка паглядзела:
Гэта што за прыгажуня?
Адгадайце! Не скажу я!

*У. Мацвеенка.*





У стаўку купаўся,
Ды сухім застаўся.
І пайшоў, гарласты,
У чырвоных ластах.

*Р. Барадулін.*

Сядзіць таўстуха пад вярбой,
Сама спрачаецца з сабой.
Убачыць бусла недалёка —
Дык боўць у рэчку з галавой.

*В. Лаўрыновіч.*





Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Прыгадайце, хто з казачных герояў гэта казаў: «Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!»

**3.** Успомніце, якімі словамі Каза-манюка палохала Ваўка і Мядзведзя.

Успомніце словы, якімі Певень выгнаў Казу з зайчыкавай хаткі.

**4.** Якімі словамі пачыналіся казкі, а якімі заканчваліся? Прачытайце.

**5.** Якая казка спадабалася вам больш за іншыя? Чаму?



**6.** Прыдумайце пытанні да казачнай віктарыны «Падарожжа па казках».



Правообладатель Национальный институт образования

## ЗМЕСТ


**КОЛЕРЫ ГОДА. ВОСЕНЬ** 3

Глянеш наўкола, крыкнеш уголас:
«Мілае лета, бывай!» *(Вера Вярба)* ....... 4
Бывай, лета! *(Паўлюк Прануза)* .......... 5
Павучковыя арэлі *(Мікола Чарняўскі)* ... 8

Ходзіць восень-чарадзейка ...................... 10
Восень *(Вера Вярба)* ............................ 11
Па лясах і палях *(Міхась Даніленка)* ... 12

Кліч над далінаю — дні жураўліныя,
птушак не вернеш назад *(Вера Вярба)* ... 14
Адлёт жураўлёў *(Якуб Колас)* ............. 15
Восень на парозе *(Паводле Уладзіміра
Ягоўдзіка)* ........................................ 17

Ходзіць восень з жоўтым клункам, носіць
дрэвам падарункі *(Максім Лужанін)* ....... 18
Лістапад у лесе *(Рыгор Ігнаценка)* ....... 20
**Абмяркоўваем прачытанае** .................... 22

**МАЁЙ РАДЗІМЫ ДЗІЎНЫ СВЕТ** 24

Ён радзімаю завецца — непаўторны
гэты край *(Міхась Пазнякоў)* ............. 25
Беларускі край *(Анатоль Зэкаў)* ......... 26
Кропелька *(Алена Кобец-Філімонава)* ... 27




Правообладатель Национальный институт образования

Блакітныя хвалі беларускага лёну ........... 30
Лён-ляночак *(Мікола Чарняўскі)* ........ 32
Хмарчын ручнік *(Паводле Расціслава Бензерука)* .................................. 35

Хлеб — усяму галава ................................ 37
Хлеб *(Леанід Улашчанка)* ................. 38
Хлебная скарынка *(Авяр’ян Дзеружынскі)* 40

Морам жыта разліваецца — нельга позіркам абняць *(Васіль Жуковіч)* ....... 42
Татава поле *(Фама Рамашка)* ............ 43
Васілёк *(Васіль Жуковіч)* ................. 46

Зямны паклон табе, Радзіма, тваім палям, тваім лясам *(Пятро Глебка)* ............... 48
Шкадаванне *(Алесь Бадак)* ................. 49
Беларускія краявіды *(Анатоль Грачанікаў)* .................... 51
**Абмяркоўваем прачытанае** ..................... 53

## ЖЫВАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ

ЖЫВАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ 55

Жывёлы побач з намі ................................ 56
Хто жыве ў траве? *(Ніна Галіноўская)* ... 56
У арэхах *(Рыгор Ігнаценка)* ............... 59



Правообладатель Национальный институт образования

Эх, каб зналі мы лясную мову, колькі казак мы пачулі б новых! *(Іван Муравейка)* ... 62
Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе *(Генадзь Аўласенка)* .............. 63
Мядзведзь *(Янка Журба)* ..................... 67

Слухай родную прыроду — ты пачуеш галасы таямнічае красы *(Васіль Жуковіч)* 70
Птушыная мова *(Васіль Жуковіч)* ......... 71
Званочкі на рабіне *(Фама Рамашка)* ..... 72

Магутны сімвал Беларусі ......................... 74
Гаспадар пушчы *(Віталь Вольскі)* ........ 75

Як лясныя жыхары будуць жыць зімою? *(Ніна Галіноўская)* ............................ 78
У лесе *(Антон Бялевіч)* ........................ 78
**Абмяркоўваем прачытанае** ..................... 80

**КОЛЕРЫ ГОДА. ЗІМА** 83

Кружацца, кружацца зоркі-сняжынкі і зіхацяць таямнічым святлом... *(Яніна Жабко)* 84
Размова сняжынак *(Ніна Галіноўская)* ... 84
Снег *(Васіль Хомчанка)* ....................... 86

Каб не галадалі птушкі, будзем ім рабіць кармушкі *(Міхась Пазнякоў)* .............. 88
Чырвоныя гронкі рабіны *(Рыгор Ігнаценка)* 89
Галка *(Васіль Хомчанка)* ....................... 92

Правообладатель Национальный институт образования

Самы светлы талент — дабрата
*(Сяргей Грахоўскі)* .............................. 94
З гары *(Васіль Жуковіч)* ...................... 95
Пагрэйся, ветрык! *(Фама Рамашка)* .... 97

Працавітаму чалавеку і мароз не страшны ... 100
Два маразы *(Апрацоўка Якуба Коласа)* ... 100

Прыходзіць Новы год, мы дзверы
адчыняем з надзеяй, каб усім
шчаслівымі нам быць *(Яніна Жабко)* ... 106
Новы год *(Уладзімір Мазго)* ................ 107
Мех, снег і смех *(Таццяна Мушынская)* 109
**Абмяркоўваем прачытанае** .................... 110

СУСТРЭЧА З КАЗКАЙ 113

Як няхітры хітрага перахітрыў ............... 114
Лісіца і Гусак ....................................... 115
Хітры Вол ............................................... 116

Мана не давядзе да дабра *(З народнага)* .... 119
Каза-манюка ........................................... 120

Адзін другога даводзіць да ліхога
*(З народнага)* ....................................... 126
Муха-пяюха ............................................. 127
**Абмяркоўваем прачытанае** .................... 130



Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Антонава** Надзея Уладзіславаўна
**Буторына** Ірына Аляксандраўна
**Галяш** Галіна Аксеньеўна

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

2-е выданне

У дзвюх частках
Частка 1

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. В. Ярыга*. Мастацкі рэдактар *З. П. Болцікава*
Мастакі *У. А. Пратасеня, Д. А. Каралькова, Н. І. Іванчык, В. А. Вайтко*
Камп’ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктар *Д. Р. Лосік*

Падпісана ў друк 26.02.2021. Фармат 70×90/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,95. Ул.-выд. арк. 4,1+0,4. Тыраж 121 535 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования